Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх паштова-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 225 (2413) Субота, 29-га верасьня 1928 г.

Аб ходзе работ па беларусізацыі ўстаноў БССР.

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б.

Ад 25 верасьня 1928 г.

1. Заслухаўшы даклад Нацкамісіі ЦВК БССР аб ходзе работы па беларусізацыі дзяржаўных, прафэсыянальных, гаспадарчых і каапэрацыйных устаноў, Бюро ЦК КП(б)Б канстатуе, што, ня гледзячы на агульныя дасягненьні ў галіне беларусізацыі ўстаноў, шэраг цэнтральных і акруговых устаноў (ВСНГ, Дзяржплян, Наркамфін, Наркамгандаль, ЦСУ і некаторыя аддзелы акрвыканкомаў, Камгас, Ваенкамат, Інспэктарыят Аховы Здароўя), ня выканалі дырэктывы партыі і пастановы ўраду БССР аб поўнай беларусізацыі сваіх апаратаў ня толькі да ліпеня 1927 г., але і да сучаснага моманту.

Гэтыя нездавальняючыя вынікі беларусізацыі маюцца, галоўным чынам, таму, што з боку кіраўнікоў памянёных устаноў дапушчана нядбайнасьць і нясур'ёзнасьць да справы беларусізацыі сваіх апаратаў. Бюро ЦК катэгарычна прапануе кіраўнікам устаноў, апараты якіх не беларусізаваны, у 3-месячны тэрмін поўнасьцю перавесьці працу апаратаў сваіх устаноў на беларускую мову.

2. Адзначаючы зусім недапушчальна слабую беларусізацыю гаспадарчых і гандлёвых устаноў (Белпапертрэст, Белдзяржсьпірт, Белдзяржгандаль, Скуртрэст, Харчтрэст, Белкаапсаюз, Лесбел), для якіх таксама тэрміны канчатковай беларусізацыі сваіх апаратаў прайшлі, Бюро ЦК КП(б)Б выносіць вымову кіраўнікам гэтых устаноў і катэгарычна прапануе ў працягу 6 месяцаў поўнасьцю перавесьці працу сваіх апаратаў на беларускую мову.

3. Побач з узмоцненай працай па поўнаму пераводу работы апаратаў на беларускую мову, паказаных у п. п. 1 і 2 адзначанай пастановы, установам ні ў якім разе не паслабляць сваёй увагі да абслугоўваньня на роднай мове працоўных іншых нацыянальнасьцяй БССР.

4. Адзначаючы некаторыя посьпехі ў справе карэнізацыі, Бюро ЦК КП(б)Б прапануе прыняць рашучыя меры да выкананьня дырэктыў ЦК аб карэнізацыі апаратаў савецкіх, гаспадарчых, каапэрацыйных і прафэсыянальных органаў.

5. Адзначаючы слабую працу прафэсыянальных арганізацый у галіне беларусізацыі сваіх апаратаў, прапанаваць фракцыі ЦСПСБ прыняць канкрэтныя меры, каб у 6-месячны тэрмін праца апаратаў прафсаюзаў, якія абслугоўваюць членаў прафсаюзаў беларусаў, была пераведзена поўнасьцю на беларускую мову, праводзячы рашучы курс на ўнядрэньне беларускай мовы сярод працаўнікоў прафсаюзных апаратаў і ўжываньне яе ў сваёй штодзённай працы.

6. Адзначаючы шэраг выпадкаў, калі асобы, скончыўшыя вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы БССР, нездавальняюча ўладаюць беларускаю моваю, прапанаваць Наркамасьветы больш рашуча дамагацца вывучэньня студэнтамі беларускай мовы ў часе навучаньня, асабліва зьвярнуць увагу на аўладаньне студэнтамі беларускаю моваю пры пераходзе на апошні курс навучаньня.

7. Адзначаючы ўнядрэньне беларускай мовы ў рабоце большасьці ўстаноў і арганізацый БССР, усё-ж канстатуецца, што якасьць пісьма на беларускай мове яшчэ зьяўляецца нізкай. Беларуская мова, як разгаворная,—ва ўстановах і арганізацыях унядраецца слаба: кіраўнікі ўстаноў і арганізацый як на пасяджэньнях, так і наогул ў сваёй рабоце ў большасьці карыстаюцца расейскай мовай. Бюро ЦК КП(б)Б прапануе ўсім кіраўнікам і адказным працаўнікам устаноў і арганізацый, якія ўладаюць беларускай мовай, абавязкова ўжываць яе ў рабоце, на сходах, пасяджэньнях і г. д. Тым-жа працаўнікам, якія да гэтага часу яшчэ беларускую мову ня вывучылі, неадкладна і ў самы кароткі тэрмін яе вывучыць. Кіраўнікам і адказным працаўнікам устаноў трымаць рашучы курс на ўнядрэньне беларускае мовы ў штодзённай рабоце ўстаноў і арганізацый, адначасна зьвярнуць увагу на палепшаньне якасьці пісьма на беларускай мове.

8. Адзначаючы, што апараты ўстаноў і арганізацый Гомельскай акругі, нядаўна далучанай да БССР яшчэ не беларусізаваны, што ўтварае цяжкасьці пры зносінах для ўстаноў, якія ў большасьці альбо поўнасьцю беларусізаваны, даручыць Гомельскаму Акругкому КП(б)Б зьвярнуць увагу на пытаньне беларусізацыі і ні ў якім разе не паслабляць тэмпу гэтае работы.

9. Даручыць Нацкамісіі ЦВК БССР прасачыць за выкананьнем гэтае пастановы і праз 8 месяцаў далажыць Бюро ЦК КП(б)Б аб выніках.

На усесаюзнай нарадзе рэдактароў.

Чарговыя пытаньні друку.

Друк і Чырвоная армія.

Прамова тав. Бубнова.

МАСКВА, 27-9. На ранішнім і вячэрнім пасяджэньнях нарады рэдактароў 25-га верасьня адбываліся далей спрэчкі па дакладу т. Інгулава. Пасьля выступленьняў Тумаркіна (Урал), Кіянадзэ (Тыфліс), Радкова (Сталіно) і іншых таварышоў з прамоваю аб друку і вайсковых пытаньнях выступіў т. Бубноў.

Вайсковы друк,—кажа т. Бубноў,—уяўляе хоць і не шматлікі, але шчыльна згуртаваны атрад, які ўваходзіць у склад савецка-партыйнага друку нашага Саюзу. У моц гэтага ўсе тыя пытаньні, з якімі вы стыкаецеся, стаяць і перад вайсковым друкам, часам нават у больш вострай форме, чымся перад агульным друкам.

Апошнія паўгодкі былі паўгодкамі не малых цяжкасьцяў. Гэтыя цяжкасьці былі зьвязаны з 2-ма асноўнымі фактамі—хлебазагатоўкамі і шахцінскаю справаю. Вайсковы друк справіўся з гэтымі цяжкасьцямі ўсё такі здавальняюча.

Пытаньне аб самакрытыцы датычыць таксама і Чырвонае арміі і вайсковага друку. Нам трэба ўсе захады ўжыць для таго, каб разгарнуць самакрытыку ў арміі. Чырвонаармейскія газэты бяруць пад абстрэл самыя рознастойныя зьявішчы, якія можна аб'яднаць пад агульным загалоўкам—бюракратычныя заганы ў вайсковым апараце і ў жыцьці арміі. Дзе-ні-дзе ёсьць перагібы ў бок агульнага абвінавачаньня каманднага складу, але трэба проста сказаць, што іменна ў гэтым пункце справа стаіць дабра. На спробы «крытыкнуць» загады камандзіра на чырвонаармейскіх сходах зараз-жа чуваць і адпор з боку саміх чырвонаармейцаў.

Мы маем магутную сетку вайскораў. Да гэтага я павінен дадаць, што нашыя вайскоры ў справе самакрытыкі вытрымліваюць экзамен досыць нядрэнна.

Яшчэ наконт „адхіленьняў". Я лічу, што мы не павінны да адхіленьняў адносіцца «ад выпадку да выпадку». Ёсьць такія адхіленьні, якія трэба зьмяшчаць, ёсьць такія адхіленьні, якіх зьмяшчаць ня сьлед, і ёсьць такія адхіленьні, за якія трэба цягнуць у ЦКК (воплескі).

Другое пытаньне, якое я хацеў закрануць, гэта аб тым, як вы, прадстаўнікі агульнага друку, глядзіце ў сваёй бягучай працы на пытаньні вайсковага будаўніцтва і на больш шырокае кола пытаньняў абароны. І вось я павінен з вялікім жалем зазначыць, што тут у нас справа дрэнная. Мы маем вялічэзны лік газэт, дзе гэтаю справаю зусім не займаюцца, або займаюцца мала, выпадкова, з бюракратычным лёгкадумствам.

Нарэшце, сярод нашых газэтных працаўнікоў мы маем недааценку ваеннае небясьпекі.

Гэтыя «настроі» павінны быць ліквіданы. Чырвоная армія, зьяўляючыся вайсковай арганізацыяй, прызначанай для вайны, адначасна праводзіць вялічэзную—гэта ня будзе перавялічэньнем—палітычную і культурную працу ў краі, сярод рабочых і сялян. І я павінен вам проста сказаць, што гэтая роля Чырвонае арміі не высьвятляецца належным парадкам у нашым друку, а яе трэба высьвятляць, бо Рабоча-Сялянская Чырвоная армія нясе ў вёску сацыялістычную асьвету, дацягваючы яе да самых глухіх куткоў нашае вёскі.

* *
*

З вялікаю прамоваю наконт становішча друку і задач, якія стаяць перад ім, выступіў загадчык АПА ЦК тав. Крыніцкі.

Далей з заключным словам выступіў т. Інгулаў.

Заключнае слова т. Інгулава

Увесь сэнс нашае нарады,—кажа т. Ігулаў,—у тым, каб лінію нашага друку накіраваць у бок праўдзеньня асноўных задач, якія стаяць у сучасны момант перад нашай партыяй. Гэтага можна дамагчыся высьвятленьнем у друку з максымальнай выразнасьцю пастаўленых пытаньняў.

Калі я казаў, што нас заядае кампанейшчына, дык я меў на ўвазе падаць адну думку, што трэба ўмець выхоўваць масы навакол канкрэтных зусім выразных задач. Іменна таму, што

САМАКРЫТЫКА ТАКСАМА НЕ КАМПАНІЯ,

а мэтад выхаваньня мас, мэтад уцягненьня мас у будаўніцтва—у самым факце існаваньня «лісткоў РСІ» ёсьць таксама элемэнт кампанейшчыны. Зразумела, безпадстаўна было-б зараз гаварыць, што «лісткі РСІ» трэба ліквідаваць—яны нават ня ўсюды ўведзены, яшчэ ня ўсюды маюць свой твар, яны яшчэ шукаюць шляху.

СТАНОЎЧАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ „ЛІСТКОЎ РСІ"

У тым, што яны пракладаюць у той гушчы коснасьці, якая яшчэ там-сям ёсьць, сьвядомасьць, што самакрытыка—зьявішча, так сказаць, легальнае, яе падтрымлівае партыя. У гэтым сэнсе «лісткі» зьяўляюцца агітацыяй за самакрытыку. Калі ідэя самакрытыкі заўладае масамі, дык «лісткі РСІ» адамруць самі па сабе, яны будуць непатрэбны, самакрытыка стане мэтадам, які прасякне ўсе галіны нашае працы.

Другое станоўчае значэньне «лісткоў РСІ» ў тым, што праз іх мы пачынаем заспоўваць арганічную сувязь між асобнымі арганізацыямі грамадзкага кантролю.

На нарадзе спрабавалі ацаніць

СУЧАСНЫ СТАН РЭАЛІЗАЦЫІ ЛЁЗУНГУ САМАКРЫТЫКІ.

Водлуг некаторых нагляданьняў, за апошнія 2-3 месяцы ў органах друку наглядаецца некаторае пасьлабленьне самакрытыкі: няма ранейшага ўздыму і ўпартасьці ў барацьбе з нездаровымі зьявішчамі. Гэта выклікаецца, як відаць, дзьвюма прычынамі: па-першае, тым, што шмат якія газэты адразу ўзялі з месца ў кар'ер вельмі высокі тон і ў некаторых выпадках з яго сарваліся, а гэта дало магчымасьць ворагам самакрытыкі выкарыстаць гэтыя памылкі друку для нападак на самакрытыку; другая прычына ў тым, што ворагі самакрытыкі сапраўды рэальна ў некаторых мясцох перайшлі ў наступ. Агонь павінен быць накіраваны, зразумела, раней усяго проці тых, якія спрабуюць абкарнаць лёзунг самакрытыкі.

Як належыць асьвятляць у друку

ПЫТАНЬНІ КУЛЬТУРНАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

Тут патрэбна найбольшая ўважлівасьць і найбольшая незамірымасьць. Між тым, уласна на гэтым вучастку найбольш цяжкім, у нас пачынаецца нейкая размагнічанасьць, нейкая расплыненасьць клясавае волі. Наш друк не аказвае патрэбнага адпору чужой ідэалёгіі, якая пранікае ў розныя галіны культурнага будаўніцтва.

У галіне абслугоўваньня розных сацыяльных колаў на нарадзе чуліся галасы за тое, каб спыніць падзяляць газэты па тыпах—рабочыя, сялянскія кіраўнічыя і г. д.; усе газэты-мешаныя, уся справа ў тым, каб кожная газэта гаварыла на спэцыяльнай мове—сялянскай, рабочай і інш. Такая пастаноўка пытаньня абсалютна няправільная. У нас дыфэрэнцыяцыя павінна пайсьці яшчэ глыбей. Мы не разглядаем сялянства, як адзіную масу, таму патрэбны больш масавыя, больш папулярныя газэты—для менш пісьменных гушчаў сялянства, менш масавыя менш папулярныя—для больш падрыхтаваных гушчаў. Патрабаваньне павысіць аўтарытэт сялянскае газэты—абсалютна правільна.

Што датычыць павышэньня кваліфікацыі рэдактара, дык апрача ўсіх тых мер, якія былі пералічаны ў дакладзе, трэба дамагчыся яшчэ і таго, каб даць магчымасьць рэдактарам часова адыйсьці ад працы і заняцца вучобаю.

Кажучы аб недахопах нашага друку, трэба спамянуць яшчэ аб адным—дагодніцтве. Рэпарцёр-рэфэрэнт ве ае, каму патрэбны бурныя воплескі, каму гучныя, каму проста воплескі, каму авацыя. Ён ведае, у якім парадку і ў якім разьмеры даць тое ці іншае выступленьне. З гэтым трэба пакончыць. Трэба трохі

БОЛЬШ БАЛЬШАВІЦКАЕ СУРОВАСЬЦІ

да саміх сябе і больш пашаны і да друку і да чытачоў, і да тых таварышоў, прамовы якіх зьмяшчаюцца.

Трэба сказаць два словы аб апараце, які абслугоўвае наш друк. Тут часткова гаварылі і добрае і кепскае. Там ёсьць недахопы, якія павінны быць зьнішчаны, але яны ў вядомай меры не залежаць ад волі працуючых там таварышоў. Калі ня будзе моцнае сувязі з газэтамі, дык недахопы гэтыя так і застануцца.

Да ТАСС'у трэба падыходзіць ня з голаю лаянкаю і з бурчэньнем, а з таварыскай самакрытыкай і калектыўнай дапамогай.

Апошняе—

АДНОСНА ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА.

Тут былі выступленьні некаторых таварышоў, якія робяць уражаньне трохі дзіўнае, нібы ўсе нашы губкомы і абласныя камітэты нічога не разумеюць у друку і ў партыйным кіраўніцтве друкам. Мы павінны з усім разуменьнем тае адказнасьці, якую мы нясём, сказаць, што кепскі той рэдактар, які спрабуе ставіць сябе побач з партыйным камітэтам і спрабуе «шукаць справядлівасьці» за межамі партыйнага камітэту. З усяго гэтага відаць, што працаўнікам друку трэба ўзяць сябе ў рукі, разумець аб неабходнасьці бальшавіцкае самадысцыпліны. Адначасна з гэтым неабходна павесьці барацьбу проці ўсякага выяўленьня палітычнае манілаўшчыны і абломаўшчыны як у партыі, так і ва ўсіх галінах будаўніцтва, і ў працы самога друку асабліва.

НАРАДА ЗАЧЫНІЛАСЯ

МАСКВА, 27-IX. 27-га верасьня раніцою адбывалася праца сэкцый. Потым да гадзіны дню працавалі па выпрацоўцы рэзалюцыі па асноўных дакладах.

На заключным пасяджэньні аднагалосна была ўхвалена рэзалюцыя па асноўным дакладзе т. Молатава, а потым з назначнымі папраўкамі і дадаткамі былі ўхвалены рэзалюцыі па дакладах т. т. Інгулава, М. І. Ульянавай і Муравейскага.

Па арганізацыйна-гаспадарчым пытаньні пастаноўлена арганізаваць камісію для выпрацоўкі шэрагу правілаў, накіраваных да палепшаньня гаспадарчага становішча газэт.

Нарада рэдактароў зачынілася прамоваю т. Крыніцкага.

ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ВЫКАНКОМУ КАМІНТЭРНУ.

Новы прэзыдыум выканкому.—Мерапрыёмствы для аздараўленьня чэхаславацкае і польскае сэкцый Камінтэрну.

МАСКВА. 3-га верасьня адбылося першае пленарнае пасяджэньне новаабранага на 6-м кангрэсе Камінтэрну выканкому.

Выканком Камінтэрну аднагалосна абраў **ПРЭЗЫДЫУМ** у такім складзе: **СЯБРЫ:** *Барбэ, Бэл, Бухарын, Гітлёў, Ілек, Като, Катаяма, Коларaў, Бэла Кун, Куусінен, Лазоўскі, Мануільскі, Молатаў, Манмусо, Прухняк, Пятніцкі, Рэмэле, Росо, Сэмар, Сэра, Сталін, Тэльман, Хітараў (КІМ), Цэткін К., Чыльбум, Чыу-Віта, Шмэраль, Эмбер-Дро, Эрколі;* **КАНДЫДАТЫ:** *Форстэр, Гансен, Гекерт, Ленскі, Мілковіч, Польліт, Цурман, Рэст (КІМ), Чан-Піао.*

У выкананьне пастановы 6-га кангрэсу Камінтэрну выканком заняўся разглядам становішча ў асобных сэкцыях Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Абмеркавана было, у першую чаргу, становішча ў 2-х партыях—чэхаславацкай і польскай, унутраны стан якіх ужо быў прычынаю дыскусіі на самым кангрэсе Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Выканком Камінтэрну ўхваліў зьвярнуцца з адкрытым лістом да ўсіх сяброў гэтых абедзьвых сэкцый Камінтэрну. Галоўная ўстаноўка, узятая пры гэтым выканкомам Камінтэрну, гэта—барацьба з правымі апартуністычнымі ўхіламі ў партыях, барацьба з фракцыйнасьцю, разгортваньне самакрытыкі, барацьба проці небясьпекі бюракратызацыі кіраўніцтва кампартыі, якая зьяўляецца спадчынаю сацыял-дэмакратычных традыцый, нарэшце, барацьба за прыбліжэньне камуністычнага авангарду да шырокае рабочае масы, ад самага кіраўніцтва кампартый—да партыйных нізоў.

Абодвы гэтыя лісты зьяўляюцца значнымі палітычнымі дакумантамі Камінтэрну. Для чэхаславацкае кампартыі адкрыты ліст азначае пачатак шырокага абмеркаваньня агульнага палітычнага і арганізацыйнага напрамку партыі. Для польскае кампартыі ён азначае сур'ёзны крок да спыненьня фракцыйнае барацьбы, якая руйнуе арганізм партыі і пагражае разваламі польскай сэкцыі Камінтэрну.

Склад палітычнага сэкратарыяту выканкому.—Дырэктывы кампартыям Францыі і Аўстрыі.

МАСКВА. 5-га верасьня адбылося першае пасяджэньне новаабранага прэзыдыуму выканкому Камінтэрну.

Прэзыдыум абраў новы **ПАЛІТЫЧНЫ СЭКРАТАРЫЯТ** у такім складзе: **СЯБРЫ**—*Барбэк, Бэл, Бухарын, Куусінен, Молатаў, Пятніцкі, Рэмэле, Сэра, Чыу-Віто, Шмэраль, Эмбэр-Дро;* **КАНДЫДАТЫ**—*Мануільскі, Лазоўскі, Хітараў (КІМ).*

На гэтым пасяджэньні прэзыдыум абмеркаваў пытаньне наконт становішча француской кампартыі і кампартыі Аўстрыі. Рэзалюцыя падкрэсьлівае выдатнае значэньне барацьбы проці ваеннае небясьпекі, якая павінна заставацца «галоўнаю восьсю ўсяе працы кампартыі Францыі».

У аднагалосна ўхваленай рэзалюцыі наконт становішча ў кампартыі Аўстрыі зазначаецца, у першую чаргу, што большасьць у ЦК аўстрыйскае кампартыі мае правільны пагляд на ўсе палітычныя пытаньні, якія абмяркоўваюцца зараз унутры партыі. Разам з тым зазначаецца на той факт, што партыя страціла значную частку свайго ўплыву і вялікі лік сяброў іменна там, дзе яна слабей адмяжоўвалася ад сацыял-дэмакратыі і прафсаюзнае бюракратыі і менш за ўсё захавала ў адносінах да іх свой уласны твар і незалежнасьць учынкаў. Толькі ў тым выпадку, калі кампартыя Аўстрыі будзе выяўляць ініцыятыву і актыўнасьць у барацьбе з фашызмам і сацыял-дэмакратыяй—яна заваюе масу рабочае і сялянскае беднаты.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Лёдзінская стачка—ня толькі стачка.

ВАРШАВА, 27-9. На думку афіцыёзнае «Эпокі», прычына апошняе лёдзінскае забастоўкі ня толькі ў спробе прадпрыёмцаў увесьці новую плату, але і наогул у кепскіх матар'яльных умовах лёдзінскіх тэкстыльшчыкаў. У зьвязку з гэтым, водлуг слоў газэты, наглядаецца рост рэвалюцыйных настрояў сярод рабочых мас.

„Палявеньне, якое за апошнія гады выкрыта сярод лёдзінскіх рабочых,—піша газэта,—зьяўляецца вельмі характэрным і трывожным зьявішчам. Усяго некалькі гадоў назад пэпэесаўцы не маглі канкураваць з прафсаюзамі нацыянальнае рабочае партыі, з прычыны свайго прадмернага радыкалізму. Цяпер-жа яны выціскаюцца камуністамі».

Звальненьне ад вайсковай павіннасьці.

Апошнімі днямі польская адміністрацыя выкрыла ў Баранавічах арганізацыю, якая звальняла ад вайсковай павіннасьці навабранцаў. На чале арганізацыі стаяў Шулякоўскі, які меў сваіх агентаў, каторыя вышуквалі адпаведных кандыдатаў. За звальненьне ад воінскай павіннасьці бралі ад 40 да 150 даляраў. Арыштавана шмат асоб, між якімі нейкага Заблоцкага, якога выпусьцілі пад залог 5000 даляраў.

Арышты ў Вільні.

Польская адміністрацыя арыштавала гэтымі днямі ў Вільні нейкую Х. Качаргінскую і Л. Гіршун, якія быццам раскідалі камуністычныя адозвы.

Арышты на савецкім пагранічча.

«Слова» (№ 221) паведамляе, што польская пагранічная варта зрабіла генэральную аблаву на савецкім пагранічча і затрымала 42 асобы, а сярод іх восем, якія быццам вялі камуністычную прапаганду.

Суд над дзісьненскімі камуністамі.

Акруговы віленскі суд на выязной сэсіі ў Глыбокім разгляда справу дзевяці асоб, абвінавачаных у прыналежнасьці да камуністычнай партыі. Суд прыгаварыў Сіняўскага на 6, А. Багрэцкага і К. Сафно на 4 і А. Дарашковіча на 1 год.

Забастоўка работнікаў гнутай мэблі.

24 верасьня г. г. выбухнула забастоўка работнікаў на фабрыках гнутай мэблі ва ўсёй Польшчы з прычыны непрыняцьця фабрыкантамі работніцкіх жаданьняў аб падвышцы на 25 проц. заработнай платы.

Справа б. пасла Галавача.

Судовы сьледавацель 3-й акругі г. Вільні дапытвае цяпер сьведкаў, з мэтай сабраць матар'ялы проці б. пасла Галавача, які 11 сьнежня 1926 г. быццам арганізаваў перад Лукіскім астрогам дэманстрацыю.

Усюды шпікі...

«Роботнік» (№ 268) даводзіць да ведама, што яму з урадавых сфэр паведамляюць «аб выкрыцьці шпіёнскай шайкі на абшары Палескага і Навагрудзкага ваяводзтваў. Арыштавана пяць асоб, вельмі цяжка западазроных, у тым ліку адміністратара маёнтку Я. Радзівіла, нейкага Сокал-Пуцілаўскага. Апрача таго, арыштавана яшчэ 13 асоб, а таксама другога члена адміністрацыі маёнтку Я. Радзівіла».

Беспрацоўе ў Горнай Сілезіі.

У часе ад 13—19 г. месяца лік беспрацоўных на абшары Сілезкага ваяводзтва раўняўся 26.415 асоб. У тым ліку разумовых беспрацоўных было 1547 асоб, выкваліфікаваных—676, нявыкваліфікаваных—9603, рольных—207.

У РЫЗЕ РЫХТУЕЦЦА АГІДНАЯ АНТЫ-РАБОЧАЯ ПРАВАКАЦЫЯ.

РЫГА, 26-9. У Рызе ходзяць чуткі, што левыя (камуністы) рыхтуюцца да ўзброенага выступленьня і да захопу Рыгі, спадзяючыся пры гэтым на дапамогу Чырвонае арміі.

Гэтыя чуткі зьяўляюцца ня толькі працягам кампаніі, распачатае паведамленьнямі правага друку аб міліёнах, нібыта атрыманых латвійскімі камуністамі з Масквы: у левых рабочых колах лічацца з магчымасьцю фашысцкіх спроб інсцэніраваць „камуністычнае паўстаньне", каб перад выбарамі напужаць дробную буржуазею і прымусіць яе галасаваць за фашыстаў.

НАПЯРЭДАДНІ НАДЗВЫЧАЙНЫХ МЕР ПРОЦІ ЛЕВЫХ РАБОЧЫХ.

РЫГА, 27-9. Выступаючы на перадвыбарчым сходзе з прамоваю аб «камуністычнай небясьпецы», міністр унутраных спраў Ляймінш заявіў, што «лібэральнасьць латвійскіх законаў паралізуе мерапрыёмствы ўраду па барацьбе з камуністамі».

Пры гэтым Ляймінш заявіў: „Рана ці позна, але давядзецца ўзьняць пытаньне аб зьмене адпаведных законаў. У гэтым цяпер пераканаліся ўсе лібэральныя колы».

РАЗРЫЎ З СССР АЖАБРАЧВАЕ АНГЕЛЬСКІХ РАБОЧЫХ.

ЛЁНДАНСКІЯ ПРАФСАЮЗЫ ПАТРАБУЮЦЬ АДНАЎЛЕНЬНЯ ЗНОСІН З СССР.

ЛЁНДАН, 25-9. Лёнданская рада прафсаюзаў ухваліла рэзалюцыю, у якой, зазначаючы на заняпад ангельскага вывазу ў СССР і рост беспрацоўя ў Англіі, дамагаецца аднавіць англа-савецкія дыплёматычныя зносіны, а таксама даць крэдыты для англа-савецкага гандлю; рэзалюцыя патрабуе, каб ангельскі ўрад неадкладна распачаў перамовы з СССР аб аднаўленьні дыплёматычных зносін. Згодна пастановы рады, гэтая рэзалюцыя перададзена Бальдвіну і Макданальду.

АПТЫМІЗМ АНГЕЛЬСКІХ ЦЬВЁРДАЛОБЫХ

ЛЁНДАН, 27-IX. У сваёй прамове на зьезьдзе кансэрватыўнае партыі ў Грэйт-Ярмуце Бальдвін заявіў, што ён ніколі яшчэ ня бачыў кансэрватыўнае партыі ў больш баявым настроі. Партыя, водлуг слоў Бальдвіна, з упэўненасьцю чакае вынікаў надыходзячых у будучым годзе ўсеагульных выбараў. Пакуль рабочая партыя не навучыцца змагацца з сваімі ўласнымі экстрэмістамі і выкрываць іх, ёй ніколі ня ўдасца атрымаць большасьці ў ангельскага народу. Што датычыць лібэральнае партыі, дык ніколі яшчэ ніводная палітычная партыя не хварэла на такую адсутнасьць адзінства ў палітыцы і кіраўніцтве, як сучасныя лібэралы.

Спыніўшыся на праграме кансэрватараў, якую яны будуць ажыцьцяўляць, калі застануцца ва ўладзе ў выніку выбараў у чэрвені і ліпені бягучага году, Бальдвін заявіў, што кансэрватыўны ўрад ставіць сабе задачаю ліквідацыю трушчоб, дастаўку таннага апалу для ўсяго краю і інш.

Закрануўшы пытаньні замежнае палітыкі, Бальдвін заявіў, што ўся Англія і ўся Эўропа разумеюць адданасьць, здольнасьць і вытрыманасьць, з якімі Чэмбэрлен накіроўваў замежную палітыку Англіі. Водлуг слоў Бальдвіна, большаю часткаю таго, што дасягнута ў Эўропе за апошніх 4 гады, трэба быць абавязаным Чэмбэрлену.

МАЛЮНАК ДА „ПРАМЫСЛОВАГА МІРУ".

ЛЁНДАН. З прычыны адмовы ўласьнікаў капальняў аплачваць звыштэрміновую працу па ўстаноўленых у згодзе правілах, у трох мясцовасьцях Ланкашырскага вугляпрамысловага раёну забаставала блізка 3-х тысяч горнарабочых. Мясцовы саюз горнарабочых, якім кіруюць рэфармісты, дамогся, што горнякі пасьля 2-х дзён забастоўкі зьявіліся да капальняў, каб аднавіць працу. Аднак, адміністрацыя ня пусьціла іх у капальні

ПРЫБАЛТЫЦКІЯ ЗЫГЗАГІ.

Англа-француское збліжэньне, якое зьяўляецца асноўным фактам сучаснага міжнароднага становішча, адбілася і на палітыцы дзяржаў, што ляжаць уздоўж нашай заходняй мяжы. І ў Польшчы і ў прыбалтыцкіх дзяржавах (Літва, Латвія, Эстонія, Фінляндыя) палітычныя варункі значна мяняюцца. Адказныя кіраўнікі гэтых дзяржаў, прыстасоўваючыся да зьмененых умоў, вагаюцца з боку ў бок і, шукаючы новага напрамку сваёй палітыкі, апісваюць незразумелыя зыгзагі.

Перш за ўсё новыя палітычныя варункі адбіліся на польскіх плянах у адносіне да Літвы. Пляны гэтыя ў асноўным, зразумела, не зьмяніліся. Польшча, як і раней, імкнецца да захопу літоўскай тэрыторыі. Але пры сучасных умовах яна, як відаць, ня можа разьлічваць на англа-француское садзейнічаньне.

Як вядома, улетку мінулага году Польшча вельмі разьлічвала, што верасьнеўская сэсія савету Лігі Нацый дасьць дазвол ёй напасьці на Літву. Верасьнеўская сэсія, аднак, не апраўдала польскіх надзей. Яна ня спрабавала нават зрабіць націск на Літву.

Справа ў тым, што да гэтага часу Англія і Францыя вялі паміж сабой упартую барацьбу за захоп кіруючага ўплыву на польскі ўрад. Польшча гэта, натуральна, выкарыстоўвала і прадавалася на чарзе то Францыі, то Англіі ў абмен за падачкі з іх боку. Аднэй з такіх падачак і было абяцаньне даць Польшчы дазвол на захоп Літвы (Ліга-Нацый павінна была, як ваўсёды, толькі аформіць дазвол).

Аднак, амаль напярэдадні выкананьня гэтага абяцаньня англа-француское спаборніцтва зьмянілася англа-француским супрацоўніцтвам. Англа-француская барацьба ў Польшчы зьмянілася аб'яднаным англа-француским націскам на Польшчу. А пры гэтых новых умовах Англія і Францыя маюць магчымасьць навязаць польскаму ўраду сваю волю і бяз усякіх падачак. Абяцанка наконт Літвы пагэтаму і была парушана.

Зразумела, што пры гэткай зьмене ўмоў Польшчы застаецца спрабаваць захапіць Літву сваімі, як гавораць, «хатнімі» сродкамі.

Пускаючы ў ход гэтыя «хатнія» сродкі, Польшча перш усяго ўзмацняе падтрыманьне цёмных дзяльцоў, якія сумесна з навярбаванымі імі бандытамі рыхтуюцца арганізаваць у Літве пераварот, каб паставіць там ля ўлады польскіх агентаў. Узмоцненаю дзейнасьцю гэтых банд у прыгранічнай паласе Польшчы і тлумачацца такія частыя выпадкі абстрэлу літоўскай варты на польска-літоўскай мяжы.

З другога боку, Польшча імкнецца забясьпечыць сабе дапамогу з боку Латвіі (магчыма і Эстоніі) Між польскім, латвійскім, эстонскім генэральнымі штабамі вядуцца, як відаць, нейкія сакрэтныя перамовы. Нездарма-ж група польскіх афіцэраў гэтымі днямі прыехалі ў Рыгу. Нездарма-ж гэта група мае намер наведаць таксама і Эстонію.

Адначасова,—судзячы па паведамленьню латвійскай газэты «Латвіа-Саргс», адзін «выдатны польскі дзяржаўны дзеяч» (прозьвішча яго газэта не называе) выступае з шчырай заявай, што Польша мае намер «заняць Літву са згоды Латвіі».

Праўда, той-жа «дзеяч» паведамляе аб намеры Польшчы захапіць таксама сем прыгранічных валасьцей Латвіі. Але, ня гледзячы на гэта, ня гледзячы нават на наяўнасьць у Польшчы яшчэ больш шырокіх захопніцкіх плянаў у адносіне да Латвіі,—латвійскае міністэрства замежных спраў выяўляе схільнасьць да збліжэньня з Польшчай. Чым-жа гэта схільнасьць тлумачыцца?—Як відаць, зноў-такі наяўнасьцю англа-француского збліжэньня.

Палітыка Латвіі заўсёды вагалася між збліжэньнем з СССР і саюзам з Польшчай, саюзам, які быў-бы нямінуча накіраваны супроць СССР. На першы шлях Латвію штурхаюць яе ўласныя інтарэсы. На другі—націск Англіі. Да гэтага часу латвійскі ўрад больш-менш спрытна ўхіляўся ад ангельскага націску. Але зараз, калі англа-француское збліжэньне значна ўзмацніла ангельскі націск, ухіленьне Латвіі слабне і яна схіляецца ў бок Польшчы.

Неабходна адзначыць, што ў той-жа час і пад уплывам таго-ж супроцьсавецкага націску Англіі, Латвія схіляецца і ў бок збліжэньня з Швэцыяй. Латвійскія ваенныя суды нядаўна наведалі швэдзкія парты, прычым іх наведаньне амаль супала з падарожжам у Стакгольм прэзыдэнтаў Эстоніі і Фінляндыі.

Арганізаваць-жа напад на СССР з боку Польшчы надзвычайна цяжка без садзейнічаньня Нямеччыны. Садзейнічаньне Нямеччыны забясьпечыць ня так лёгка, паколькі англа-француское збліжэньне моцна б'е па нямецкіх інтарэсах. Між тым існаваньне саюзу прыбалтыцкіх дзяржаў пад кіраўніцтвам Швэцыі і пад камандай Англіі зрабіла-б больш лёгкім напад на СССР з боку Балтыцкага мора.

Маюцца весткі, што спроба арганізаваць гэты прыбалтыцкі саюз правалілася. Гэта магчыма. Але бясспрэчна, што супроцьсавецкая праца на прыбалтыцкім вучастку нашай граніцы будзе весьціся далей. Мы павінны ўважліва глядзець у гэты бок. **І. С.**

У Саюзе ССР.

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ І СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ.

МАСКВА, 27-IX. У апошні час наглядаюцца выпадкі, калі хлебазагатоўчай працы спажывецкае каапэрацыі перашкаджаюць іншыя загатоўцы. Па просьбе Цэнтрасаюзу Нарком Гандлю тав. Мікаян зазначыў усім мясцовым органам НК Гандлю на няправільнасьць і незаконнасьць адхіляць спажывецкую каапэрацыю ад хлебазагатоўчага рынку.

Партыя і Урад,—зазначана ў тэлеграме Мікаяна,—прызналі і замацавалі за спажывецкай каапэрацыяй загатоўчую працу, посьпех якое мае велізарнае значэньне для агульнага ходу і разьвіцьця хлебазагатовак. З гэтае прычыны прапануюрабіць поўнае падтрыманьне і ўжыць усе захады, каб стварыць нармальныя ўмовы да загатоўчае працы спажывецкае каапэрацыі, да ўзьняцьця актыўнасьці яе працы, а таксама да рашучага ўзьдзейнічаньня на асобныя арганізацыі спажывецкае сыстэмы, якія ўхіляюцца ад хлебазагатовак. Катэгарычна забараняецца незаконнае зачыненьне ссыпак спажывецкае каапэрацыі і іншыя незаконныя ўчынкі, якія маюць на мэце зьменшыць загатоўкі спажывецкае сыстэмы.

Ушанаваньне „Красіна“ ў Тромсэ.

ЛЁДАКОЛ „КРАСІН“, 27-9. У часе стаянкі лёдаколу ў Тромсэ лёдакол наведалі прадстаўнікі мясцовае камуністычнае арганізацыі і прафсаюзаў. Адбыўся невялікі мітынг, на якім выступілі старшыня камуністычнае арганізацыі і яго намесьнік. У адказ выступіў Орас.

А 3-й гадз. уночы 27-га верасьня лёдакол вышаў з Тромсэ.

ОРДЭН ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ „КРАСІНУ“.

ЛЕНІНГРАД. Камісія па арганізацыі спатканьня лёдаколу «Красін» падае на разгляд урады прапанову ўзнагародзіць «Красіна“ ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу.

Контр-рэвалюцыйная арганізацыя ў Кубані.

РАСТОЎ. У кастрычніку ў краявым судзе распачынаецца разгляд справы контр-рэвалюцыйнае арганізацыі студэнтаў кубанскага сельска-гаспадарчага інстытуту. На чале арганізацыі сталі сынкі папоў, ранейшых афіцэраў і чыноўнікаў. Арганізацыя ставіла сабе задачу зьнішчыць органы ДПУ, скінуць савецкую ўладу і легалізаваць усе палітычныя партыі старога часу.

Да 10-х угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі арганізацыя выпусьціла значны лік антысавецкіх лістовак. Расчараваўшыся ва ўплыве лістовак, арганізацыя рашыла перайсьці да дынаміту і бомбаў. Былі намечаны выбух памяшканьня кубанскага Гістпарту і чыгуначнага мосту, а таксама забойства небясьпечнае для арганізацыі асобы, якая ведала пра яе існаваньне,—Зіны Крыловай. Крылова была скінута з мосту ў Кубань.

На лаўцы падсудных 22 чалавекі.

Вытрымка зьберагла ад катастрофы.

МАСКВА. 26-га верасьня ля Тэрмезу стыкнуліся два пасажырскія самалёты „Дабралёту“. Стычка здарылася праз 10 хвілін пасьля вылету абодвых самалётаў з Тэрмезу ў Ташкент. Дзякуючы выключнай вытрымманасьці пілётаў аварыі ня здарылася. Самалёты прыляцелі ў Ташкент. Пацярпеўшых няма.

Стычка здарылася з прычыны таго, што адзін самалёт ляцеў па над другім. Верхні самалёт трапіў у „паветраную яму“ і скінуўся на сподні самалёт. Віздэляж сподняга самалёту прабіты вінтом і коламі верхняга. Калі-б пілёты хоць трошкі перапужаліся, дык пагібель была-б няўхільнаю. Лётнікі адразу зразумелі становішча: адзін востра накіраваўся ўгару, а другі пачаў зьніжацца. Ад катастрофы ўхіліліся. Абмеркаваўшы магчымасьць ляцець далей, абодвы пілёты спакойна прывялі свае машыны ў Ташкент, праляцеўшы адлегласьць у 753 кілёмэтры і зьявіўшыся на месца без ніякага спазьненьня.

Змаганьне з перакідкамі настаўнікаў у РСФСР.

МАСКВА. З прычыны заўважаных у некаторых мясцох масавых звальненьняў і перакідак настаўнікаў у выніку свавольства адміністрацыі школьных установ, НКПрацы РСФСР прапануе мясцовым органам распачаць самую рашучую барацьбу з гэтым зьявішчам.

Новыя кадры ленінцаў.

ЦЬВЕР, 27-IX. З дню юбілею 25-х угодак другога зьезду партыі па Цьвярской губэрні ўступіла ў партыю 658 чалавек, з іх 88,5 проц. рабочых. Амаль што ўсе яны працуюць на вытворчасьці. Сярод уступіўшых—164 жанчыны. У некаторых паветах у партыю паўступалі парабкі і сяляне.

Першыя замаразкі.

МАСКВА, 27-9. Учора ўночы наглядаліся першыя ў сёлетнім годзе замаразкі, якія ахапілі Беларусь, Ленінградзкую вобласьць, Цэнтральна-прамысловую вобласьць і частку Цэнтральна-Чорназёмнае.

У раёне Ціміразеўскае Акадэміі тэмпэратура зьнізілася да аднаго градусу. На дахах і дротах быў прымецен іней.

У кулацкай Літве.

АРЫШТЫ АГЕНТАЎ ПЛЯЧКАЙЦІСА.

КОЎНЯ, 27-IX. Літоўскі друк паведамляе аб учыненых гэтымі днямі ў правінцыі вобысках і арыштах сярод сацыял-дэмакратаў, абвінавачаных у падтрыманьні сувязі з Плячкайцісам.

Літоўскія эсдэкі заклікаюць да барацьбы з Вальдэмарасам.

ЦК літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі, які знаходзіцца на эміграцыі, праклямаваў энэргічную і рашучую барацьбу з урадам Вальдэмараса. Гэтая праклямацыя агалошана ў форме адозвы і ў тысячах экзэмпляраў раскідана на абшары цэлай Літвы.

«Дз. Віл.» (№ 219), які паведамляе аб гэтым, дадае, што быццам літоўскае духавенства сымпатызуе гэтай акцыі і дапамагае распаўсюджваць намянёныя адозвы.

Чорны габінэт у літоўскай арміі.

«Дзеньнік Віл.» (№ 219) паведамляе, што літоўскае міністэрства абароны выдала сакрэтны загад кантраляваць усе лісты, адрэсаваныя да афіцэраў і салдатаў, як таксама гэтых апошніх да сваіх родных. Цэнзура гэтая мае сваёю мэтай дасьцерагчы, каб вайсковыя ня мелі кантакту з эсдэкамі.

Галадоўка польскіх вязьняў у Коўні.

«Кур'ер Віл.“ (№ 220) паведамляе, што ў ковенскім астрозе галадуюць 7 арыштаваных у Кашэдарскай акрузе быццам польскіх шпікоў. Прычынай галадоўкі зьяўляецца нялюдзкае катаваньне арыштаваных з мэтаю прымусіць іх сазнацца ў прыпісаных ім праступках.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Кулакі—ворагі калгасаў.

У вёсцы Дубавой, Магілеўскай акругі, кулакі падпалілі дом арганізатара калектыўнае гаспадаркі, інваліда працы.

У агні загінула ўся маёмасьць.

Кантрактацыя выканана на 70 проц.

БАБРУЙСК. 27-9. На 20 верасьня сельска-гаспадарчымі крэдытнымі таварыствамі па акрузе закантрактавана 7330 гэктараў азіміны.

Плян кантрактацыі пасеваў выканан на 70 проц.

Заданьне Акрсельсаюзу выканалі на 100 процантаў Бабруйскае, Парыцкае, Шацілкаўскае, Шчадрынскае, Клічаўскае, Сьвіслацкае, Сялібскае, Чыжэвіцкае крэдытныя таварыствы.

Ціхініцкае таварыства сваё заданьне выканала на 110 процантаў.

Адстаюць у гэтай справе Любаньскае, Асіпавіцкае, Семяжоўскае таварыствы, якія выканалі 10 проц. заданьня.

Падатак здаюць у тэрмін.

(Рагачоўскі р., Бабруйшчына).

Паступленьне падатку ў касу фінчасткі ідзе шпаркім крокам, асабліва ў тых с.-с., якія сумелі скласьці вакол своечасовага паступленьня падатку грамадзкую думку. К такім с.-с. можна аднесьці:—Дварэцкі, Запольскі, Курганскі і інш. Але ёсьць с.-с., якія зусім адстаюць з узысканьнем падатку. Да такіх належыць Азяранскі, Старасельскі і Прыбарскі с.-с. Усяго паступіла на 20-IX-28 г. 40000 рублёў, або 67 проц. першай раты. Асабліва ахвотна ўносяць падатак маламоцныя гаспадаркі, якія ўплачваюць падатак цалкам, заможныя-ж наадварот выплату адцягваюць.

УЗМАЦНЕНЬНЕ БЮДЖЭТАЎ С.-С.

МАГІЛЕЎ, 27-9. Да 16 маючыхся самастойных сельсавецкіх бюджэтаў дадаецца ў надыходзячым гаспадарчым годзе яшчэ адзін (Раднянскі сельсавет, Клімавіцкага раёну).

У мэтах узмацненьня фінансавай базы сельскіх бюджэтаў, акрвыканком ухваліў перадаць сельсаветам маёмасьць сельскага значэньня на іхняй тэрыторыі, а таксама іншых даходных крыніц, у разьмеры, здавальняючым бездэфіцытнае зьвядзеньне бюджэтаў.

НЕАБХОДНА ДАПАМОГА.

(Рагачэўскі р-н, Бабруйшчына).

28 жніўня ў вёсцы Азяраны ад невядомых прычын выбухнуў пажар, якім зьнішчана 10 сялянскіх двароў з усімі надворнымі будынкамі і 5 гумён з дабром.

Дзякуючы актыўнай працы пажарнай дружыны, вёска Азяраны і Хвалевіч распаўсюджвацца пажару не далі.

У выніку пажару, 10 сямей засталіся без кавалку хлеба, адзежы і будоўлі. Трэба тэрмінова дапамагчы пацярпеўшым.

РАБОЧЫХ—НА АДКАЗНЫЯ ПАСАДЫ.

ГОМЕЛЬ, 28-IX. У апошні час саюзныя арганізацыі ўзмацнілі ўвагу пытаньню аб вылучэньні рабочых на адміністрацыйную і прафсаюзную працу. У Добрушы старшыня фабкому фабрыкі «Герой Працы» вылучан на пасаду дырэктара фабрыкі «Спартак». Саюз сельска-гаспадарчых рабочых вылучыў рабочага саўгасу Старое Беліцы Грычаніка на пасаду кіраўніка саўгасам.

Вылучана парабчанка на пасаду сэкратара Веткаўскага райкому саюзу сельска-гаспадарчых рабочых, канюх конзаводу Бародзін вылучан на пасаду старшыні Гомельскага райкому, аб'ежчык Плышэўскі вылучан на працу ў Рэчыцкім райкоме саюзу.

ПАДАТАК ВЫКАНАН НА 61,1 ПРОЦАНТ!

ВОРША, 28-9. На 22 верасьня па акрузе паступіла сельска-гаспадарчага падатку першага тэрміну на суму 188.232 руб. Заданьне выканана на 61,1 проц. На першым месцы ідуць раёны: Дрыбінскі, выканаўшы 82 проц. заданьня, Расьнянскі—78,5 проц. і Амсьціслаўскі—75,4 проц.

Апошнімі ідуць раёны Талачынскі—37 проц. Дубровенскі—37 проц. і Чарэйскі—42,9 проц.

КААПЭРАВАНЬНЕ БЕДНАТЫ.

Віцебск, 28-9. Гарадзкі камітэт узаемадапамогі пачаў прымаць заявы на залічэньне ў пайшчыкі Віцебскага цэрабкопу. У пайшчыкі цэрабкопу прымаюцца сэзонныя і падзённыя рабочыя, саматужнікі, а таксама бедныкі.

Недахопы, якія трэба паправіць.

На Пухавіцкім прызыўным пункце маецца толькі адзін міліцыянэр, які ня можа без адпачынку вартаваць ноччу маёмасьць прызыўнога вучастку. З Пухавіцкай міліцыі паведамлялі, што міліцыянэр накірован яшчэ адзін з г. Чэрвеня, але ўжо прайшло паўтары нядзелі і ніяк гэты міліцыянэр ня прыедзе

У каапэратыўным ларку, які абслугоўвае прызыўнікоў, няма ні булак, ні белага хлеба. Трэба было-б Пухавіцкай каапэрацыі пахадайнічаць перад Белкаапсаюзам аб водпуску белай мукі для абслугоўваньня прызыўнікоў. На гэта ня так шмат трэба.

У двары прызыўнога пункту тут-жа і сельсавет і часовая, мясцовая бальніца, страшэннае антысанітарнае становішча, але сельсавету гэта як быццам ня тычыцца, ці ўвайшло ў прывычку жыць у балоце?

ЯКУБ.

ВЫКАНАНЬНЕ ДРУГАРАДНЫХ ВІДАЎ ЗАГАТОЎКІ.

Віцебск, 28-9. Спачатку загатоўчай кампаніі на 1 верасьня г. г. усе загатоўчыя арганізацыі Віцебскай акругі выканалі гадавое заданьне па загатоўцы другарадных відаў экспартнага сырцу на 87,1 проц.

КУРСЫ ДЗЕСЯТНІКАЎ-БУДАЎНІКОЎ.

Гомель, 28-9. У новым будаўнічым сэзоне патрабуецца кадр дзесятнікаў-будаўнікоў. Акраддзяленьне саюзу, у мэтах падрыхтоўкі дзесятнікаў-будаўнікоў, арганізуе 6-7 месячныя курсы па падрыхтоўцы 40 дзесятнікаў, галоўным чынам, з складу кваліфікаваных рабочых будаўнікоў. Адчыненьне курсаў адбудзецца ў кастрычніку месяцы.

ПРАЦУЕ ЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Кайкаўскі камітэт узаемадапамогі за апошні час разгарнуў сваю працу. У мінулым годзе ў камітэце ўсяго было 38 руб. фонду. Зараз-жа к-т сабраў ужо каля 500 руб.

Камітэт распазычыў сярод сялянства 150 руб. грашыма і 100 пудоў насеньня.

Наогул праца камітэту пашыраецца.

Пабудова хлебазаводу ідзе нармальна.

Гомель 28-9. Пабудова хлебазаводу праходзіць нармальна. Корпус заводу амаль гатоў: над цестаразьдзелачным аддзяленьнем будуецца дах, у аддзяленьні мукасейкі заканчваецца цагляная кладка, у пякарнай залі засталося перакрыць вокны, столь і дах: Адначасна будуецца фундамант пад пажарныя печы. Сталярныя работы праведзены амаль на 50 процантаў. З матар'ялаў адчуваецца недахоп толькі ў цэгле і ў цэманце. Матар'ял для першага апалу ўжо закуплен.

Рабочыя сучаснае хлебапякарні моцна цікавяцца пабудовай хлебазаводу. На сваіх вытворчых нарадах прапрацоўваюцца асобныя дэталі працы ў будучым заводзе. Імі знойдзена, што печы ў старой пякарні належыць пакінуць у цэласьці для выпечкі розных булак. Мяркуецца арганізаваць мэханізаваную выпрацоўку булак, арганізаваць развоз прадукцыі так, каб возчыкі не датыкаліся рукамі да прадукцыі.

Землеўпарадкаваньне ідзе здавальняюча.

Згодна пляну Акрза, у гэтым годзе заканчваецца землеўпарадкаваньне Гарэніцкай дачы. Землеўпарадкавана 3664 гэктары, з якіх збудавана 18 пасёлкаў і 52 хутары.

Пагоская дача ў гэтым годзе ня скончана, з прычыны нявысылкі Акрза землеўпарадкаваццеляў. Вакантны плян раёну выканан слаба, з прычыны адсутнічаньня належнага ліку каморнікаў, а таксама і з боку насельніцтва, якое несваечасова ўносіла грошы для працы па землеўпарадкаваньню. Землеўпарадкавана па вакантнаму пляну 1388 гэктараў. Цяга насельніцтва ў раёне да землеўпарадкаваньня вялікая. У наступны момант ёсьць заявы 16 вялікіх вёсак.

Неабходна Акрза даць дастатковы лік каморнікаў, каб праводзіць працу добра і своечасова.

Бярэзінскі р., Меншчына.

Чаму калгасы засталіся без палепшанага насеньня?

МАГІЛЕЎ, 28-9. Частка ўноў арганізаваных калгасаў, якія сёлета правадзілі пасеў у першы раз, засталіся без палепшанага насеньня. Плянам Белсельтрэсту было вызначана прадаць з саўгасаў толькі 534 цэнтнэры насеньня, і продаж звыш гэтай колькасьці рашуча забаронен. Гэтая колькасьць і была закуплена і разьмеркавана паміж калгасамі.

Акрамя таго, плян прадугледжваў абмен з саўгасаў 1216 цантнэраў. Гэтую мажлівасьць калгасы не маглі скарыстаць, паколькі ў іх ня было чаго мяняць, і яны маглі толькі купіць (пры дапамозе крэдыту).

ЗАГАТОЎКА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ ТАВАРАЎ.

Гомель. 28-9. У акрузе хлебазагатоўкі пачалі разгортвацца. З 10-га па 20-е верасьня загатавана сельска-гаспадарчых прадуктаў на 46.319 руб. Асобнымі загатоўцамі загатавана: Палессельсаюзам на 12.990 р., Райсаюзам—4762 р. Дзяржгандлем—16.467 руб., іншымі загатоўцамі—12.100 руб.

Хлебных прадуктаў загатавана ў колькасьці 172,2 тон.

Культурная рэвалюцыя і ліквідацыя няпісьменнасьці

(ДАКЛАД Т. БАЛІЦКАГА НА ПАСЯДЖЭНЬНІ 26 ВЕРАСЬНЯ).

З вялікім дакладам на тэму «Культурная рэвалюцыя і ліквідацыя няпісьменнасьці» выступіў Нарком Асьветы т. Баліцкі.

Камунізм немагчымы бяз высокага ўзроўню культуры шырачайшых працоўных мас—кажа дакладчык:—толькі пры адначасовым падняцьці гаспадаркі і культуры, як двух бакоў аднаго і таго-ж сацыялістычнага будаўніцтва, мы зможам дайсьці да камунізму. Пралетарыят і працоўнае сялянства ва ўмовах царскай Расеі займалі асобнае палажэньне ў культурных адносінах: іх культурны ўзровень ня мог падымацца; цемру і беднасьць атрымалі яны ў спадчыну ад царскай Расеі. Толькі праз Кастрычнікаўскі пераварот, толькі пры дыктатуры пралетарыяту рабочыя і працоўнае сялянства могуць падняць свой культурны ўзровень настолькі, каб будаваць і пабудаваць сацыялізм і камунізм. У. І. Ленін, асабліва перад сваёй сьмерцю, у упор ставіў пытаньне аб культурнай рэвалюцыі; Н. І. Бухарын на XVI Маскоўскай губ. канфэрэнцыі заявіў, што ніколі культурная рэвалюцыя так настойліва ня стукалася ў дзьверы, як яна стукаецца зараз; XV зьезд партыі канкрэтна паставіў пытаньні, зьвязаныя з культурнай рэвалюцыяй.

Чаму зараз так настойліва стаіць пытаньні культурнай рэвалюцыі?

Праблема культурнай рэвалюцыі высоўваецца ў зьвязку з сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва. Рэканструкцыя прамысловасьці на новай тэхнічнай базе, мэханізацыя, хэмізацыя, электрыфікацыя патрабуюць новых кадраў культурных рабочых і высока-кваліфікаваных інжынэраў і тэхнікаў; інтэнсыфікацыя, машынізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі патрабуюць культурных сялян; барацьба з бюракратызмам і ўцягваньне рабочых і працоўнага сялянства ў сацыялістычнае будаўніцтва патрабуюць значнага падвышэньня граматнасьці і культурнасьці самых шырачайшых колаў працоўнага насельніцтва і ў першую чаргу і галоўным чынам рабочых і бяднейшага сялянства; абвастрэньне клясавай барацьбы ў зьвязку з наступленьнем сацыялістычных элемэнтаў у гаспадарцы, культуры і грамадзе і актывізацыяй у процівавагу капіталістычных элемэнтаў патрабуе ўзмацненьня барацьбы за ідэалёгію пралетарыяту і чыстату ленінскай лініі; падрыхтоўка да абароны краіны таксама патрабуе значнага падвышэньня культурнага ўзроўню самых шырачайшых працоўных мас.

Тав. Баліцкі прыводзіць шэраг прыкладаў, якія яскрава паказваюць, як усе гэтыя высунутыя камуністычнай партыяй задачы ўпіраюцца ў праблему культурнай рэвалюцыі. Адно падвышэньне граматнасьці сярод працоўнага насельніцтва дасьць велізарны эфэкт у гаспадарцы краіны. Выходзячы з чыста навуковага абасноўваньня эканамічнага значэньня народнай асьветы на падставе аналізу праф. Струміліна аб гаспадарчым эфэкце ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня, тав. Баліцкі прыходзіць да вываду, што затраты на ўвядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня, роўныя 134 мільлёнам рублёў, дадуць дзяржаве эканамічны эфэкт, правышаючы два мільярды рублёў; процант сродкаў, укладзеных на правядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня, акупаецца старыцаю.

Справа аднэй граматнасьцю абмежавацца ня можа; перад намі стаіць задача выхаваньня новага чалавека. Калёным жалезам трэба выпаліць адмоўныя зьявы ў нашай псыхіцы, прывычках, быце. Рашучы агонь накіраваць на абломаўшчыну, разгільдзяйства, п'янства, хуліганства, хабарніцтва, падхалімства, палавую распушчанасьць, нячыстаплотнасьць, падсіжываньне, нячулыя адносіны да чалавека, веру ў бога, забабоны, ідэалёгію 20 числа, антысэмітызм, спадзяваньне на «авось».

Энтузіязм у працы, самыя добрасумленыя адносіны да справы, дзелавітасьць, вера ў сілу грамады, калектывізм, інтэрнацыяналізм, клясавую сьвядомасьць, сазнаньне, што чалавек, гэта моц у грамадзе, што культурны пралетарыят будзе вяршыцелем лёсу ўсяго сьвету,—вось што мы павінны выхаваць у чалавеку. Выхаваўчую працу вядзе ня толькі школа, яе вядуць: партыя, прафсаюзы, Чырвоная армія, саветы і ўвесь наш грамадзкі і дзяржаўны апарат. У нас у школах наглядаецца шэраг адмоўных зьяў у выхаваўчай працы, з якімі мы павінны рашуча змагацца.

Тав. Баліцкі прыводзіць шэраг прыкладаў, адмоўных у сэнсе выхаваньня зьяў у школе: прыклады антысэмітызму, любоўнай эротыкі і г. д., якія сьведчаць, што ня ўсё на гэтым фронце абстаіць добра, што трэба ўзмацніць выхаваўчую працу ў школах.

Падставай для ўсякай культуры і культурнасьці наогул зьяўляецца граматнасьць. Бяз звычайнай граматнасьці ня можа быць і рэчы аб культуры. У. І. Ленін сказаў, што няпісьм. чалавек стаіць па-за палітыкай; яго спачатку трэба навучаць грамаце. У сэнсе граматнасьці ў нас справа абстаіць дрэнна. Па ліку вучняў, якіх прыходзіцца на 100 душ насельніцтва, Савецкі Саюз займае 25 месца ва ўсім сьвеце, толькі Румінія і Партугалія стаяць ніжэй нас—усе іншыя краіны стаяць вышэй. Сама пачатковая школа наша дае невялікую грамату; досыць сказаць, што мы толькі ў 1933-34 годзе думаем абвясьціць усеагульнае абавязковае навучаньне на базе чатырох гадовай школы, у той час, скажам, як Нямеччына даўно ўжо праводзіць усеагульнае абавязковае навучаньне на базе васьмігадовай школы. Няпісьменнага насельніцтва на эўрапейскай частцы РСФСР налічваецца 55,9 проц., па БССР гэты процант яшчэ большы—59,3 проц; асабліва вялікая няпісьменнасьць сярод жанчын. У сэнсе раўнапраўя жанчыны мы зрабілі больш, чым любая краіна; ні ў аднэй краіне такіх праў жанчыне ня дадзена як у нас; відзе так ня борунца за вызваленьне жанчыны як у нас і ў той самы час няпісьменных у нас сярод жаночага насельніцтва ў эўрапейскай частцы РСФСР 66,8 проц., у БССР—72,2 проц.

З агалашоных лічбаў відаць, што Беларуская Рэспубліка зьяўляецца больш адсталай у культурных адносінах, чым Эўрапейская частка РСФСР, яшчэ да гэтага часу. Тлумачыцца гэта тым, што БССР, як нацыянальная краіна бышай Расеі, была ў мінулым акраінай значна адсталай ад інш. частак Расеі. Так, у 1887 г. у эўрапейскай частцы РСФСР на 1000 душ насельніцтва прыходзілася граматных 229 ч. (22,9 проц.), на тэрыторыі сучаснай БССР толькі 178 чал. (17,8 проц.); у 1920 годзе па эўрапейскай частцы РСФСР на 1000 душ насельніцтва было граматных 374 чал. (37,4 проц.), у БССР—315 чал. (31,5 проц.); у 1926 годзе на тыя самыя 1000 душ насельніцтва было граматных у эўрап. частцы РСФСР 441 чал., (44,1 проц.), у БССР 407 чал. (40,7 проц.).

Мы наганяем РСФСР, але яшчэ поўнасьцю не нагналі. Тэмп росту пісьменнасьці ў нас значна большы, чым у РСФСР. Так, з 1897 г. па 1926 год пісьменнасьць вырасла ў эўрапейскай частцы РСФСР на 94 проц., у БССР—на 128 проц.; з 1920 па 1926 год пісьменнасьць вырасла ў эўрап. частцы РСФСР на 18 проц., у БССР на 26 проц.

У БССР больш школ прыходзіцца на 1000 душ насельніцтва, чым у РСФСР.

Тое, што мы пры савецкай уладзе расьцём большым тэмпам, чым РСФСР, зьяўляецца зусім нармальным. Мы павінны дагнаць РСФСР і далей ужоісьці разам. Сутнасьць нацыянальнай палітыкі заключаецца ў тым, каб падцягнуць адсталыя нац. краіны Савецкага Саюзу ў гаспадарчых, палітычных і культурных адносінах.

Мы даганяем, але ў нас няпісьменных надзвычайна многа. Зараз трэба рашуча распачаць барацьбу з няпісьменнасьцю; зараз, як ніколі, трэба ўспомніць лёзунг Вялікага Леніна: „Кожны пісьменны павінен навучыць аднаго няпісьменнага“. Гэта вялікая задача ліквідацыі няпісьменнасьці стаіць зараз перад кожным сьвядомым грамадзянінам, перад кожным культурным працаўніком. Агульнымі сіламі мы з гэтай задачай справімся; мы атрымаем перамогу і на фронце культуры, гэтаксама, як атрымалі перамогу на фронце грамадзянскай вайны.

Пленум Аршанскага акругкому КП(б)Б.

(*Па тэлефону ад нашага карэспандэнта*).

ВОРША, 28-IX. 27 верасьня г. г. а 6-й гадзіне ўвечары адчыніўся пленум Аршанскага акругкому партыі.

На пленум прыехалі: старшыня ЦВК БССР і сябра бюро ЦК КП(б)Б тав. ЧАРВЯКОЎ, загадчык АПА ЦК КП(б)Б тав. СТАСЭВІЧ і нам. Народнага Камісарыяту РСІ тав. ВІЛЕНСТОВІЧ.

Пленумам будуць вырашыны наступныя пытаньні.

1. Становішча культурнага будаўніцтва ў акрузе. 2. Аб ходзе загатовак. 3. Аб пяцігадовым разьвіцьці народнае гаспадаркі Аршаншчыны і 4. Аб ходзе кампаніі па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі.

Учора вечарам быў заслухан даклад аб культурным будаўніцтве, у якім было зазначана пагоршаньне матар'яльнага базісу масавых культурна-асьветных установ, нязначнае палепшаньне якаснага складу працаўнікоў і сацыяльнага складу вучняў.

Таксама зазначана поўнае выкананьне на 1928 год пляну школьнага будаўніцтва, стабілізацыя ліку палітасьветных установ і некаторае палепшаньне мэтадычнай працы.

У спрэчках па дакладу выступала шмат т. т. у тым ліку і тав. ЧАРВЯКОЎ. Замест былога сэкратара Акругкому тав. Стасевіча, які абраны пленумам ЦК загадчыкам АПА ЦК КП(б)Б, пленум акругкому абраў адказным сэкратаром Акругкому КП(б)Б тав. ВІЛЕНСТОВІЧА.

САВЕЦКАЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ І АБАРОНА СССР.

Зараз кожны ўжо ўцяміў выключнае значэньне ўдзелу шырокай савецкай грамадзкасьці ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР. Наша Чырвоная армія ўяўляе сабой досыць надзейную зброю для абароны нашага спакою. Яе баявая падрыхтоўка штогод удасканальваецца і мацнее. Аднак, падрыхтаванасьць толькі аднэй Чырвонай арміі яшчэ не зьяўляецца выстарчальнай для абароны нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны, асабліва перад пагрозай бязупыннага ўзброеньня нашых ворагаў і ў прыватнасьці паветрана-хэмічных рыхтаваньняў імпэрыялістаў, што ўжо зьяўляецца непасрэднай пагрозай нават так званаму мірнаму насельніцтву тылу краіны. Гэтая пагроза зьяўляецца ў значнай меры вострай для нас, насельніцтва БССР, якому ў першую чаргу прыдзецца прыняць на сябе ўдары наступаючага ворага.

У гэткіх умовах справа абароны будзе вырашана тады, як яна зробіцца блізкай справай кожнага рабочага і работніцы, кожнага селяніна і сялянкі. Гэта справа тым лягчэй можа быць ажыцьцёўлена ў нас, бо ніводная краіна ў сьвеце ня мае гэткіх велізарных магчымасьцяй для разгортваньня шырокага грамадзкага руху вакол абароны, як наш Саюз Рэспублік, бо наша сапраўды мірная палітыка, якую мы гэтак упарта праводзім, відавочна нават адсталым пластом насельніцтва нашага неабдымнага СССР.

У першыню імкненьне савецкай грамадзкасьці да ўдзелу ў абароне краіны выявілася ў сакавіку 1919 г. і асабліва ў часы ноты Керзона. Ініцыятывай і сіламі працоўных у адказ на пахабны ультыматум была створана эскадрыльля самалётаў «Ультыматум» і таварыства сяброў паветранага флёту, якое ў кароткі тэрмін ахапіла сваім уплывам звыш паўтара мільёны сяброў. У маі 1924 г. па ініцыятыве працоўных мас ствараецца таварыства сяброў хэмічнай абароны і прамысловасьці СССР, якое паставіла сабе мэтай садзейнічаць справе хэмічнай абароназдольнасьці СССР. Гэтае таварыства таксама ў кароткі тэрмін уцягнула ў свае шэрагі звыш мільёна членаў. У 1925 г. абедзьве гэтыя арганізацыі зьлучаюцца ў адно таварыства сяброў авіяцыйнай і хэмічнай абароны і прамысловасьці—Авіяхім, якое шырока разгортвае сваю працу па ваенізацыі насельніцтва і мабілізацыі грамадзкай думкі вакол справы абароны. Зараз гэта таварыства мае больш 3 мільёнаў сяброў і 40.000 ячэек у самых глухіх кутках нашай краіны. У БССР Авіяхім мае каля 2000 ячэек і 100.000 сяброў, значная частка якіх праходзіць практычны курс ваенізацыі ў розных родах гурткоў. Арганізацыі таварыства па СССР маюць каля 7000 авіяхімаўскіх кутоў, 12000 гурткоў вайсковых ведаў і па вывучэньню авіяцыі і хэміі, 8000 стралковых гурткоў 1200 плянэрных і мадэльных гурткоў і 2000 бібліятэк. Сацыяльны склад таварыства ў БССР наступны: вайсковых—18 пр., рабочых 37,7 проц., служачых—26,3 проц., сялян—16,4 проц. і вучняў—8,6 пр. Такім чынам, мы бачым, што гэтае таварыства зьяўляецца сапраўднай масавай рабоча-сялянскай арганізацыяй абароны.

Да верасьня 1928 году авіяхім перадаў чырвонай авіяцыі больш 250 самалётаў. Нават ворагі нашы прымушаны з паважаньнем аднесьціся да гэтай лічбы. Пабудавана шмат аэрадромаў і ангараў. Усяго Чырвонай арміі аказана дапамогі на суму больш 8 мільёнаў рублёў. Перададзены эскадрыльлі «Ленін № 1», „Ленін № 2“, «Імя Дзяржынскага», «Ультыматум», «Атрады», «Наш адказ Чэмбэрлену», „Чырвоны Балтыец“, «Ільліч Украіны», «Чырвоная Масква», першая брыгада і цэлы шэраг іншых. Поруч з гэтым таварыства разгарнула вялікую дзейнасьць па аказаньню дапамогі розным навуковым арганізацыям і інстытуцыям, вытворчым прадпрыёмствам і вынаходцам, якія працуюць у галіне абароны краіны. Авіяхімам гэткім арганізацыям аказана дапамога на суму звыш 2 мільёнаў руб.

Вялікую ролю ў справе ўзмацненьня савецкае авіяцыі адыгралі вялікія пералёты, якія былі арганізаваны ў 1926 і 1927 г. г. У гэты час т. Громаў разам з мэханікам Радзевічам у працягу трох дзён абляцеў Эўропу, а т. т. Шастакоў і Фуфаеў лёталі з Масквы ў Токіё. Значэньне гэтых пералётаў тым больш вялікае, што яны адбываліся на самалётах савецкай канструкцыі, якія, такім чынам, вытрымалі генэральную праверку. У ліпені 1927 году быў праведзен «Тыдзень абароны», які паказаў велізарны матар'яльны посьпех. У фонд «Наш адказ Чэмбэрлену» было сабрана каля дзесяці мільёнаў рублёў. Былі вызначаны (з гэтага фонду) буйныя сумы для пабудовы магутнага інстытуту хэмічнай абароны, які ў дні дзесяцігодзьдзя Чырвонай арміі (люты 1928 г.) быў перададзен Рэўваенсавету.

Апроч таго, таварыства дапамагло шмат якім хэмічным лябараторыям і інстытутам. Авіяхім удзельнічаў у вырашэньні асноўных праблем разьвіцьця савецкай хэмічнай прамысловасьці, якая, як вядома, зьяўляецца надзейнай базай хэмічнай абароны. Асаблівая ўвага аддавалася пытаньням наладжаньня ўзорнай азотнай вытворчасьці: фосфару, калія, брому, бадану і багхэду, якія маюць вялікае значэньне як у народнай гаспадарцы, так і ў абароне.

Важнае значэньне мае сельска-гаспадарчая дзейнасьць таварыства, якая выяўлялася ў культываваньні мінэральных угнаеньняў, ахове садоў, палёў, лясоў і г. д. Мы тут закранулі толькі працу ТДА-Авіяхіму ў справе дапамогі ўзмацненьню абароназдольнасьці Чырвонай арміі.

Досыць значная праца таксама праведзена ў справе арганізацыі насельніцтва для абароны ад паветрана-хэмічнага нападу ворага. Азнаёмім чытача з сыстэмай падрыхтоўкі Авіяхімам насельніцтва да паветрана-хэмічнай абароны.

Формай гэтай падрыхтоўкі зьяўляецца авіяхіматрады, якія арганізоўваюцца на больш буйных прадпрыёмствах, альбо пры гарадзкіх ці раённых саветах Авіяхіму. Авіяхіматрад падзяляецца на каманды: 1) паветранага нагляду, абвяшчэньня і сувязі, 2) хэмічную, 3) пажарную і па ахове грамадзкага парадку і спакою і 4) мэдычна-санітарную. Апроч таго, ён мае агульны рэзэрв атраду. Мы тут прыводзім гэтае асноўнае падзяленьне авіяхіматрадаў для таго, каб чытач мог сабе ўявіць асноўныя напрамкі дзейнасьці авіяхіматраду як у выпадку паветранага нападу ворага, гэтаксама і ў парадку падрыхтоўкі насельніцтва да абароны ад неспадзянак, якія могуць быць з боку ворага.

Праца па ваеннай падрыхтоўцы насельніцтва, поруч з падрыхтоўкай іх да паветрана-хэмічнае абароны, зьяўляецца аднэй з найбольш важных задач таварыства.

Гурткі ваенных ведаў зьяўляюцца асноўнай формай масавай працы па ваеннай падрыхтоўцы насельніцтва. Адносна развою гэтае працы лепш усяго гаворыць факт стварэньня да гэтага часу каля 12.000 гурткоў падобнага тыпу. Апроч працоўных, якія ніякай вайсковай падрыхтоўкі не прайшлі, гурткі вайсковых ведаў ахапляюць дапрызыўнікаў, пераменны склад тэрытарыяльных аддзелаў, а сетка гурткоў павышанага тыпу—таксама і начсклад запасу.

Апроч таго, дзесяткі тысяч рабочых і сялян абслугоўваюцца працай васьмі тысяч стралковых гурткоў, у якіх загартоўваецца будучы чырвоны баец.

У апошнія часы выявілася новая форма ваенізацыі працоўных—паходы і манэўры. Апошнія ахапляюць дзесяткі тысяч чалавек у розных раёнах СССР. У кіеўскіх манэўрах, якія гэтымі днямі адбыліся, прымалі ўдзел спэцыяльныя авіяхімаўскія атрады, якія да манэўраў прайшлі належную падрыхтоўку. У справе падрыхтоўкі жывое сілы для паветранага флёту і ўзмацненьня яго тэхнікі вялікае значэньне набывае масавая спартыўная праца Авіяхіму, якая ідзе ў напрамку: плянэрнага спорту, мадэльнага спорту, паветранага лёту і галубінага.

Трэба таксама адзначыць працу таварыства лёгкаматорнае авіяцыі, гідраглісэрнай справе і аэрасаннага спорту. У справе мадэльнага і плянэрнага спорту мы, ня гледзячы на кароткі тэрмін іх разьвіцьця ў СССР, паказалі шэраг сусьветных рэкордаў. Адносна нашых магчымасьцяў у справе лётнага спорту гаворыць факт палёту т. Чухноўскага, які зьдзівіў увесь сьвет. Паход „Красіна“ і палёт Чухноўскага, арганізаваныя Авіяхімам, паказалі ўсяму сьвету нашую моцную арганізаванасьць, нашыя посьпехі і нашы сілы.

Авіяхім вядзе таксама навукова-дасьледчую працу і працу па ўзмацненьні тэхнікі Чырвонае арміі. Трэба адзначыць, што ў нас вельмі дасьледавана эканоміка нашае краіны з пункту гледжаньня яе прыстасаваньня да патрэб абароны. У гэтым напрамку таварыствам вядзецца вялікая праца, да якое нават прыцягваюцца замежныя навуковыя сілы. Навукова-дасьледчая праца ахапляе як у цэнтры, гэтаксама і на месцы ўсе навукова-дасьледчыя сілы, якія жадаюць прынесьці свае веды для справы ўзмацненьня тэхнічнае магутнасьці СССР і яго вартаўніка—Чырвонае арміі.

З гэтага нарысу дзейнасьці таварыства, дапамогі абароне і авіяцыйна-хэмічнаму будаўніцтву СССР відаць, як шмат ужо зроблена савецкай грамадзкасьцю для ўзмацненьня абароны краіны. Аднак, неабходна ўсё-ж адзначыць, што зроблена яшчэ мала, задаволіцца посьпехамі мы ўсё-ж яшчэ ніякага права ня маем. Калі глянем на дзейнасьць нашых вогараў у гэтым напрамку, дык убачым, што мы ад іх яшчэ вельмі адстаём. Колькасьць дабрахвотных таварыстваў ваеннага характару ў нашых суседзяў гаворыць пра абхват і тэмп іх дзейнасьці. Толькі ў аднэй Польшчы, апроч «Лігі паветранай і супроцьгазавай абароны“ і „Стралковага Саюзу» (300.000 чал.), мы налічваем яшчэ блізка каля дзесятку ваенна-грамадзкіх арганізацый са значнай колькасьцю членаў. Між тым, наша неабдымная краіна на 130 мільёнаў насельніцтва мае толькі 3.000000 членаў авіяхіму. Сябрамі абароны краіны павінны быць дзесяткі мільёнаў грамадзян. У працягу бліжэйшага году колькасьць стралковых гурткоў павінна павялічыцца ў параўнаньні з мінулым у тры разы. Трэба, як мага лепш абсталяваць нашыя мясцовыя авіяхімаўскія арганізацыі, каб яны сапраўды мелі магчымасьць праводзіць ваенізацыю насельніцтва.

Н. Ш.

Суды пры сельсаветах.

Посьпехі ў справе набліжэньня суду да насельніцтва пасьля праведзенага восеньню 1924 г. раёнаваньня вельмі значныя. Народны суд раўнамерна абслугоўвае ўвесь раён у той час, як раней ён рэгулярна абслугоўваў толькі тую воласьць, у якой знаходзілася камэра народнага суду. Зараз практыкуюцца выезды народных судоў у больш насельныя пункты—для разгляду спраў па месцы. Лік гэтых выездаў з кожным годам павялічваецца. І усё-ж такі нельга сказаць, што дасягнутыя посьпехі ўжо цалкам задавальняюць інтарэсы сялян.

У вёсцы ёсьць шмат дробных спрэчак, з вырашэньнем якіх справа абстаіць ня зусім добра. Напрыклад, справа аб патраве, страта ад якой раўняецца 3—5 руб., або іншая якая-небудзь дробная спрэчка патрабуе ад селяніна звароту яго ў райён за 10—15 вёрст, а часам і больш, для падачы заявы ў народны суд. Затым селяніну трэба зьявіцца ў народны суд і другі раз на разгляд справы. Праз два тыдні, г. зн. пасьля сканчэньня тэрміну на абскарджаньне, селянін павінен зьявіцца ў трэці раз за выканаўчым лістом. І гэта трэба яшчэ прызнаць становішчам нармальным, так як могуць быць ускладненьні ў справе, разгляд справы можа быць адкладзен і тагды прыйдзецца селяніну зьяўляцца ў райён яшчэ раз і не аднаму, а з некалькімі сялянамі (ісцец, адказчык, сьведка, панятыя).

Рублёў 3 або 5 у бюджэце селяніна адыгрываюць значную ролю і ўсё-ж частка сялян прымушана махнуць рукой на магчымасьць іх атрыманьня, каб спагаяючы іх ня страціць яшчэ больш. Тое самае можна сказаць і аб дробных зямельных захватах, аб нязначных сямейных падзелах і г. д.

Улічваючы гэткае становішча ў справе вырашэньня дробных сялянскіх спрэчак Цэнтральны Выкан. Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР 1-га верасьня 1928 г. прынялі пастанову аб утварэньні судоў пры сельскіх саветах. На першы час пастаноўлена арганізаваць сельскія суды толькі па аднаму ў кожным раёне.

Якія ставяцца мэты ўтварэньнем сельскіх судоў? Гэтых мэтаў некалькі. Раней за ўсё—большае набліжэньне суду да насельніцтва. Сялянства будзе мець магчымасьць дробныя справы вырашаць у сябе дома, эканоміць і час і сродкі на яўку ў народны суд, або ў раённую зямельную камісію. Сельскія суды павінны паскорыць разгляд спраў, а значыцца і скараціць валакіту, так як наступіўшая справа ў сельскі суд павінна быць вырашана ня больш як у працягу 2-х тыдняў. Хуткасьць атрыманьня здавальненьняў па некаторых справах (аб патравах) павялічваецца дзякуючы таму, што па гэтых справах, якія найбольш хвалююць вёску ў летні час, абскарджаньні не дапушчаюцца і пастановы будуць зараз-жа выконвацца. У гэтых адносінах сельскія суды павінны адыграць рашучую ролю ў барацьбе з патравамі. Утварэньне сельскіх судоў таксама мае мэтай разгрузку народных судоў ад дробных спраў і тым самым палепшаньне якасьці работы нарсудоў.

Разгляд спраў у сельскіх судох вызваляецца ад збораў. Бюракратызм у сельскіх судох ня можа мець месца, так як там для яго няма адпаведнай глебы: сельскія суды ня зьвязаны пры разглядзе справы ніякімі фармальнасьцямі.

Арганізацыя сельскіх судоў установлена наступная. Члены сельскіх судоў выбіраюцца на адзін год на агульных сельскіх сходах у колькасьці 12 членаў. Гэта колькасьць можа павялічвацца ў залежнасьці ад ліку выбарчых вучасткаў у сельскім савеце. Членамі суду ня могуць быць асобы пазбаўленыя выбарчых правоў. Старшыня суда выбіраецца пленумам сельскага савету з ліку членаў савету. Тэхнічнае абслугоўваньне суда ўскладаецца на сельскі савет. Сельскі суд разглядае справы ў складзе старшыні і двох членаў суду.

Сельскі суд можа разглядаць наступныя справы: іскі на суму да 20 рублёў, (апроч іскаў аб заработнай плаце), спрэчкі аб патравах, захватах зямлі, перакосах, пераворках і г. д., справы аб утрыманьні старшых членаў двара і справы аб падзелах. Сельскі суд ня мае права разглядаць іскаў, стараной у якіх зьяўляюцца дзяржаўныя ўстановы, альбо прадпрыемствы.

Справы разглядаюцца сельскім судом публічна і вусна. Пастановы суду запісваюцца і агалашаюцца старанам. Пастановы па зямельных справах можна абскардзіць у раённую зямельную камісію, а пастановы па грамадзянскіх справах у народны суд. Пастановы па справах аб патраве ня могуць быць абскарджаны. Інструктаваньне і рэвізія сельскіх судоў ускладаецца на адпаведныя народныя суды, а па лініі разгляду зямельных спраў—на раённыя зямельныя камісіі.

Сельскія суды будуць арганізоўвацца ў час наступаючай перавыбарчай кампаніі, так як адначасна з выбарамі сельскіх саветаў будуць выбірацца і члены сельскіх судоў.

Падбор адпаведных кандыдатур у сельскія саветы справа вельмі адказная. Калі-ж улічыць тое, што выбіраемыя склады сельскіх судоў будуць першымі, што суды арганізоўваюцца пакуль-што ў відзе вопыту, што падсуднасьць спраў сельскім судам досыць значная, што ад іх работы будзе залежаць лёс далейшага іх існаваньня,—будзе зусім ясным, што к справе падбору кандыдатур у сельскія суды трэба правіць асобную увагу. Няўважлівасьць, недбайнасьць у гэтым напрамку могуць павясьці к дыскрэдытацыі наогул самай ідэі ўтварэньня сельскіх судоў.

Райвыканкомы павінны загадзя падрыхтавацца к правядзеньню выбараў у сельскія саветы і падшукаць у тым савеце, дзе сельскі суд будзе арганізаваны, адпаведныя кандыдатуры. Гэтыя кандыдатуры неабходна раней загаварыць на сельскіх сходах. У кожным сельскім савеце можна знайсьці неабходны лік годных членаў сельскага суда. У сельскія суды трэба вызначыць кандыдатуры актыўных батракоў і батрачак, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, камсамольцаў, членаў прафсаюзу рабземлес, селькораў і іншых актывістых. Кожны агульны выбарчы сход павінен даць у сельскі суд толькі самых лепшых і сумленных грамадзян, якія карыстаюцца грамадзкім давер'ям, выявіўшых сябе на грамадзкай рабоце, падаючых прыклад іншым ня толькі сваёй грамадзкай дзейнасьцю, але і дамашнім жыцьцём. Старшынёй суду сельскія саветы павінны вылучыць свайго найбольш аўтарытэтнага члена.

У выніку добрага падбору членаў сельскіх судоў будуць утвораны сапраўды сялянскія, народныя, у поўным сэнсе гэтага слова, суды, якія значна палепшаць бытавое становішча сялян, прыцягнуць рэвалюцыйную законнасьць у самыя глухія вёскі.

Сельскім судам у іх рабоце будуць абавязаны аказваць належную дапамогу райвыканкомы і сельскія саветы, народныя суды і зямельныя камісіі, грамадзкія арганізацыі, камітэты сялянскай узаедапамогі і г. д.

Агульнымі сіламі будзе ўтворана яшчэ адна моцная масавая арганізацыя, якая ўцягне новыя кадры сялян у савецкую работу і прынясе сялянам вялікую карысьць.

А. Патосін.

НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

Разгортваем малочную прамысловасьць

Малочная справа ў Мазырскай акрузе канцэнтруецца ў сельска-гаспадарчых каапэратывах і працуе праз малочна-масларобча-сыраварныя каапэрацыйныя аб'яднаньні.

На 1-X—27 г. існавала 16 малочна-масларобчых арцеляў, з іх фактычна працавала 7 арцеляў і адзін масларобчы завод, які за 1927 г. прарабіў вялікую працу, перапрацаваўшы 507104 літры малака, выпрацаваўшы 19904 клгр. масла. Астатнія 7 арцеляў за 1927 г. перапрацавалі 219056 літраў малака і выпрацавалі 9615 клгр. масла. У сярэднім на адну арцель прыпадае 30 гаспадарак і 65 кароў. У 1926-27 г. на разьвіцьцё малочнае справы было выдадзена крэдытаў, як доўгатэрміновых, так і кароткатэрміновых 24900 руб. і г. д. Побач з дасягненьнямі ў разьвіцьці малочнае прамысловасьці па нашай акрузе маюцца і недахопы, на якія зацікаўленым установам прыйдзецца зьвярнуць увагу. Малочныя арцелі слаба працуюць, гэта нам паказваюць лічбы іхняе выпрацоўкі. Пры арганізацыі некаторых арцеляў ня ўлічваліся эканамічна-гаспадарчыя магчымасьці існаваньня гэткае, мала было зьвернута ўвагі на кіраўнічыя органы арцеляў і рэвізыйных камісій, адсутнічаюць кваліфікаваныя працаўнікі, слабае кіраўніцтва з боку акрсельсаюзу і г. д. Усё гэта адзначыла Мазырская Акруговая Пляновая Камісія, якая дала Акрсельсаюзу шмат дырэктыў у сэнсе палепшаньня пастаноўкі працы, а ўласна: правесьці рэарганізацыю дробных малочных арцеляў, аб'яднаўшы іх у буйныя; пры арганізацыі новых арцеляў мець на ўвазе эканамічныя гаспадарчыя ўмовы мясцовасьці, ужыць захады да ўцягваньня бядняцкага сялянскага насельніцтва ў арцелі. Забясьпечыць арцелі малочным інвэнтаром і г. д. Трэба спадзявацца, што Акрсельсаюз выканае заданьні, якія на яго ўсклала пляновая камісія.

Яўхім.

КАНТРАКТАЦЫЯ БЭКОННЫХ СЬВІНЕЙ.

Адной з галоўных умоў нашай пасьпяховай загатоўчай працы павінна зьявіцца кантрактацыя тых ці іншых тавараў. Шляхам кантрактацыі нам удасца больш прадукцыйна загатовіць сыравіну, але трэба адзначыць, што ня ўсе органы ідуць насустрач гэтай справе, гэта нешта для іх новае, быццам невядомае. Вось для прыкладу падам наступны факт.

На Белдзяржгандаль ускладзена заданьне загатовіць пэўную колькасьць бэконных сьвіней; зразумела, што ў гэтай справе сельска-гаспадарчая каапэрацыя павінна займаць першае месца і Белдзяржгандаль зноў спаткаўся з сваім «прыяцелям» — Белсельсаюзам.

— Давай, брат, заключым дагавор на дастаўку корму для сьвіней, а таксама на кантрактацыю з вашага боку і г. д., ведаеш-жа пастанову Наркамгандлю аб гэтым.

Мяўся, мяўся Белсельсаюз і адказаў: «добра, паглядзім»...

І вось гэта «добра—паглядзім» цягнецца больш месяца. Белдзяржгандаль напамінае, награжае, скардзіцца ў іншыя органы, а Белсельсаюз, як звычайна, адцягвае,

Фінансавыя органы таксама нядбайна і няўважліва адносяцца да заданьня Наркамгандлю, і Белсельбанк, які павінен быў зараз-жа адпусьціць грошы на кантрактацыю, спакойна заяўляе: «Грошы я вам дам, але крыху пазьней, прыблізна ў кастрычніку-лістападзе, зараз у нас балянсавы час, не магу»...

І пачалася старая знаёмая валынка: беганіна ад Белсельсаюзу ў Белсельбанк, адтуль у Дзяржбанк, і яшчэ кудысьці, а кантрактацыя чакае... ля мора пагоды.

Кантрактацыя бэконных сьвіней гэта новая справа, і неабходна было з самага пачатку гэтай працы ўзяцца інтэнсыўна за яе выкананьне, а між тым, дзякуючы нейкім капрызам, гэта справа ня рухаецца.

У будучым цэлы шэраг кантрактацый: па цыбулі, бульбе і іншых сельска-гаспадарчых відах сыравіны. Калі «галава» каапэрацыі—Белсельсаюз і яго бліжэйшы таварыш «Белсельбанк» так будуць адносіцца да справы, дык нічога ня будзе. Тут неабходны, як кажуць, «быстрота и натиск».

Новая загатоўчая кампанія пачалася і нельга чакаць ніводнай хвіліны. Гэта недапушчальная справа.

А. Манін.

Садовая гаспадарка гор. Слуцку.

Агульная плошча, якую займаюць сады гораду, раўняецца каля 115 гэкт. З паказанай плошчы большая частка занята пад сады дробныя для ўласнага ўжытку, аднак ёсьць досыць значная частка садоў, маючых прамыслова-таварны характар.

Мясцоваму камгасу належыць 69 садоў, усяго плошчаю 48 гэктараў. Камунальныя сады аддаюцца ў эксплёатацыю з таргоў, прычым вынікі здачы ў гэтым годзе паказваюць значнае павышэньне прыбытковасьці ў параўнаньні з мінулымі гадамі: калі за 1925 г. прыбытак ад садоў не правышаў 3000 руб., то ў гэтым годзе за сады выручаецца звыш 6000 руб. Апошнія вынікі дасягнуты дзякуючы таму, што ў мінулыя гады галоўная ўвага звярачвалася на культывіроўку і ўпарадкаваньне садоў, што абгаварвалася ў дагаварох з арандатарамі ў убытак іх грашовай прыбытковасьці.

Як агульны недахоп, трэба адзначыць, што выпаўненьне дагавароў арандатарамі камунальных садоў, асабліва ў частцы культывіроўкі, праводзіцца недастаткова. Прыватныя арандатары культывіруюць сады павярхоўна, выходзячы з сваіх інтарэсаў, кіруючыся тэрмінам дагавору арэнды, з найменшай затратай сродкаў—пры чым, як агульнае зьявішча, наглядаецца, што арандатары не запрашаюць для культывіроўкі спэцыялістых садаводаў, лічачы сябе досыць знаёмымі з гэтай справай, каб абходзіцца бяз іх, або каб таньней каштавала, робячы гэтым значныя страты для дзяржаўнай маемасьці. Апошняе пацьвярджаецца тым, што за мінулы год камгасам было ўзьнята на арандатараў садоў 11 судовых спраў за невыкананьне дагавароў і ў выніку прысуджана ў карысьць камгасу 2.200 руб.

Важна яшчэ падкрэсьліць, што камгас амаль не звярачвае ўвагі на дадатковую пасадку дрэў, а гэтаксама і на пашырэньне існуючых садоў

Далейшыя перспэктывы слуцкіх садоў палягаюць тым, што ў 1929 годзе намячаецца прыстасаваць фабрычны будынак быв. алейнага заводу Бабруйскага камунальнага трэсту пад фруктова-мармаладную фабрыку, што дасьць магчымасьць гаспадарча скарыстоўваць сталую эксплёатацыю садоў.

ЗЬНІШЧЫМ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ.

Актыўны ўдзел у ліквідацыі няпісьменнасьці павінен быць штодзённым абавязкам усіх нашых культурных працаўнікоў.

Настаўніцтва за пісьменнае Палесьсе.

(Юравіцкі раён, Мазыршчына).

Справаю ліквідаваньня няпісьменнасьці горача зацікавілася грамадзкасьць нашага раёну наогул, а асабліва настаўніцтва і палітасьветнікі. На райканфэрэнцыі настаўніцтва 15-16 верасьня г. г. стаяла спэцыяльна аб гэтым пытаньне. Удзельнікі вельмі сур'ёзна аднесьліся да абгаварэньня пытаньня ліквідацыі няпісьменнасьці. Шмат гаварылася аб тым, каго лічыць няпісьменным, а каго малапісьменным. Да якой катэгорыі аднесьці ўмеючага толькі расьпісацца, альбо толькі прачытаць некалькі слоў.

Канфэрэнты ўжо ня раз сустракаліся на гэтым шляху барацьбы, затым і разважалі так рэальна, так практычна. Цікавіліся, як паставіць пытаньне з ліквідацыяй так, каб зьліквідаваўшая няпісьменнасьць асоба і далей падвышала сваю адукацыю. Раілі высоўваць іх на працу ў сэкцыі сельскіх саветаў, камітэты ўзаемадапамогі, чырвоныя куткі і інш.

Многія з удзельнікаў канфэрэнцыі ўжо правялі па сваіх вёсках перапіс няпісьменных і малапісьменных.

Па вёсках раёну арганізуюцца ячэйкі П. Н., якія праз падпісныя лісты і іншымі шляхамі прыступілі зараз-жа да збору сродкаў у фонд барацьбы з няпісьменнасьцю. У мясцовым клюбе наладжваюцца вечары-спэктаклі дзеля збору сродкаў у фонд барацьбы з няпісьменнасьцю.

Па скончэньні канфэрэнцыі адбылася раённая канфэрэнцыя па ліквідацыі няпісьменнасьці, дзе абраны раённы савет. На гэтай канфэрэнцыі прысутнічалі прадстаўнікі амаль што ад усіх ячэек П. Н. і большая частка настаўніцтва з палітасьветнікамі. Выдзелены асобы на шасьцітыднёвыя курсы ліквідатараў у Мазыры.

Падрыхтоўчая праца ва ўмовах нашага Палесься мае значную каштоўнасьць.

Лукашэвіч.

Сіроцінскі раён—не на апошнім месцы.

(Віцебшчына).

Камісія па правядзеньню месячніка „За грамату" ў раёне складзена 18-IX. Позна, але-ж праца распачалася раней, чым пачала працаваць камісія. Распачаў працу камсамол і загадчык апорнага лікпункту.

Камсамол праводзе вучот няпісьменных па раёну і праводзе своечасова; гэта дасьць пэўную магчымасьць раскінуць сетку лікпунктаў і школ малапісьменных у належных мясцох, чаго ня будуць мець іншыя раёны. Вучот будзе сталым. Гэта дасьць раёну магчымасьць скласьці тэрытарыяльны плян—пяцігодку.

Робячы перавучот, камсамольцы арганізуюць ячэйкі т-ва „Прэч няпісьменнасьць". Намечана арганізаваць 10 ячэек. Пачатак ужо ёсьць.

18-IX арганізавана адна ячэйка ў вёсцы Сіроціна. Праведзена адна лётарэя, якая дала 18 руб. Мяркуецца правесьці яшчэ дзьве. Камсамол арганізуе суботнік на чыгунцы, па выгрузцы баласту, на які беспартыйная моладзь прыходзе запісвацца. Прафсаюз і каапэрацыя далі згоду адлічыць з культфонду сродкі на ўтрыманьне лікпункту, дзе будуць навучацца парабкі.

19 вясковых школ сацвыху ўзялі шэфства над няпісьменнымі вёскамі.

Раённая сямёхгодка арганізуе лікпункт і дае настаўнікаў, якія будуць працаваць па чарзе, у парадку грамадзкай нагрузкі.

Гэтаму прыкладу трэба пасьледаваць усім сямігодкам.

На такіх лікпунктах праца не павінна абмяжоўвацца толькі навучаньнем грамаце. На іх павінен знайсьці працу і грамадавед, і прыродазнаўца і г. д.

Шчыры ўдзел камсамолу, настаўніцтва і адпаведных таварышоў у часе падрыхтоўкі да месячніка дае магчымасьць сказаць, што Сіроцінскі раён займе не апошняе месца ў ліквідацыі няпісьменнасьці на Віцебшчыне.

Я. Н.

На шляхах жывой працы.

(Полацкая акруга).

Культурны паход пачаўся. Чыннасьць на фронце месячніка па ліквідацыі няпісьменнасьці распачалася з 15 верасьня. Першыя весткі такія:

У горадзе Полацку створаны 3 новыя ячэйкі «П. Н.». Па раёнах праходзіць арганізацыйнае афармленьне ячэек і райсаветаў «П. Н.», якія ў свой час былі распаліся, ці амаль што распадаліся ад дрэннага кіраўніцтва з боку раённых і акруговага саветаў «П. Н.».

Дзеля ўмацненьня сродкамі т-ва П.Н. праводзіцца скарбоначны збор па гораду і лётарэя, а таксама зроблена накідка на білеты ў кіно і тэатры ў размеры да 10 проц. Адначасова практыкуюцца вызавы на дапамогу праз газэту „Чырвоная Полаччына".

Перад Акр. Саветам прафсаюзаў узьнята пытаньне аб выдзяленьні прадпрыемстваў, дзе сіламі т-ва «П. Н.» і студэнтамі пэдтэхнікуму будзе зьнішчана няпісьменнасьць як сярод сябр. саюзу, так і сярод іх сем'яў.

Са ўсіх раёнаў адстае Лепель, які не дае ніякіх зьвестак аб тым, што ім зроблена ў справе падрыхтоўкі да месячніка і за першыя дні месячніка.

Меляшкевіч.

Па Гомельшчыне.

ШКОЛЫ ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ Ў ГОМЕЛЬШЧЫНЕ.

Сёлета па акрузе будзе працаваць 173 лікпункты, 85 школ для малапісьменных і 158 груп. дзеля няпісьменных і малапісьменных.

Ліквідацыю няпісьменнасьці па вёсках будуць праводзіць пераважна настаўнікі сацвыху і толькі ў рэдкіх выпадках будуць скарыстоўвацца спэцыяльныя ліквідатары няпісьменнасьці.

КААПЭРАЦЫЯ—НА БАРАЦЬБУ З НЯПІСЬМЕННАСЬЦЮ.

Мяркуецца, што сёлета Райсаюз і Палессельсаюз адчыняюць на свае сродкі лікпункты для каапэраванага жыхарства.

Кустпрамсаюз павінен будзе заняцца ліквідацыяй няпісьменнасьці сярод членаў арцеляў, Палессельсаюз —сярод членаў калгасаў, с.-г. арцеляў і г. д.

Спажывецкая і с.-г. каапэрацыя мяркуе адлічыць на ліквідацыю няпісьменнасьці да 25 проц. свайго культфонду.

УДАРНЫЯ ГРУПЫ.

Пры ўкамплектаваньні лікпунктаў і школ для малапісьменных будуць прыняты ў першую чаргу парабкі, с.-г. рабочыя, дапрызыўнікі і бедныякі. З іх будуць складзены ўдарныя групы. Там, дзе ёсьць належная колькасьць парабкоў, для іх будуць адчыняцца спэцыяльныя лікпункты.

Пры дэлегацкіх інстытутах будуць створаны спэцыяльныя групы.

Крэдытная каапэрацыя ў Меншчыне.

(Са зьезду ўпаўнаважаных крэдытных таварыстваў Менскай акругі).

15 і 16 верасьня адбываўся зьезд упаўнаважаных крэдытных т-ваў Менскай акругі. Галоўнаю мэтаю зьезду была арганізацыя Менскага акруговага крэдытнага саюзу, бо да астатняга часу крэдытаваньне сельскага насельніцтва ішло выключна праз Белсельсаюз, які бязумоўна ў абставінах значнага росту крэдытных таварыстваў на далейшы час ня мог-бы здавальняюча весьці гэтую цэнтралізаваную працу. Жыцьцё і практыка паставіла і вырашыла пытаньне аб дэцэнтралізацыі крэдытнага абслугоўваньня нашае вёскі і калектывізаваных гаспадарак.

Са справаздачы старшыні Белсельсаюзу тав. Аксючыца, якая была зроблена зьезду, відаць, што на 2-га ліпеня агульны лік каапэраваных аб'яднаньняў па Менскай акрузе—272. Па свайму напрамку яны разьмяркоўваюцца ў наступным парадку:

1) Сельска-гаспадарчых крэдытных т-ваў 40, якія маюць 46128 сяброў, 2) калгасаў 126 з 855 сябрамі, 3) садова-гародніх т-ваў 1—сяброў 11, 4) машынных т-ваў 16—сяброў 216, меліарацыйных 1 з 45 сябрамі, 5) жывёлаводных—21 з 85 сябрамі, 6) малочных арцеляў—52 з 3855 сябрамі, 7) с.-г. т-ваў 5 з 645 сябрамі, 8) пчалярных 1 з 149 сябрамі, кантрольных 6 з 27 сябрамі і 9) нарэшце насеннаводных 3, сяброў 156. Такім чынам усяго па акрузе каапэравана 52172 гаспадаркі, што становіць каля 38,9 проц. усіх гаспадарак акругі.

У параўнаньні з 1926 годам колькасьць каапэраваных гаспадарак узрасла на 15,7 проц., што зьяўляецца пэўным дасягненьнем, якое можа сьведчыць аб жыцьцёвасьці гэтае працы на шляху нашага агульна-сацыялістычнага будаўніцтва.

Сярэдні пай з 3 р. 66 к. на аднаго пайшчыка ў 1926 г. цяпер павялічыўся да 5 р. 99 к. Таксама ўзрасьлі і ўклады супроць 1926 г. на 142 проц., а проці мінулага году за тры кварталы бягучага—на 61 проц.

Ёсьць дасягненьні і ў гаспадарчай сувязі нізоўкі са сваім цэнтрам, і збыт проці мінулага году павалічыўся з 52,4 проц. да 57 проц., а набыцьцё праз каапэрацыю з 20 проц. да 40 проц.

Ня менш цікавым будзе адзначыць і сацыяльны склад пайшчыкаў крэдытных т-ваў: беднякоў 34,6 проц., сераднякоў 62,4 проц. і заможнікаў 2,9 проц. Тутака мы наглядаем недастатковасьць абслугоўваньня беднаты і на гэты бок свае далейшае працы з'езд зьвярнуў асаблівую ўвагу.

Яшчэ адно з найбольшых дасягненьняў—гэта чысты прыбытак па 38 т-вах складае суму 18.046 і адначасова зьмяншэньне пераатэрміновых пазычак у два разы за першае паўгодзьдзе бягучага году. Гэта яскрава сьведчыць, што крэдытная каапэрацыя цьвёрда становіцца на ўласныя ногі.

Але побач з гэтым на зьездзе падрабязна былі высьветлены і тыя значныя недахопы, якія наглядаюцца ў працы крэдытных таварыстваў.

Галоўны з гэтых недахопаў—недастатковасьць крэдытных таварыстваў: на адно т-ва прыходзіцца 3528 гаспадарак. Зразумела, што абхапіць усю гэтую масу пры такім радыусе ня лёгка. Таму зьезд намеціў у сваім бліжэйшым пляне—арганізацыю яшчэ 11 крэдытных т-ваў па акрузе.

Другім недахопам зьяўляецца тое, што лік паасобных укладчыкаў надта нязначны, а ў сувязі з гэтым і ўклады маюць нязначную ўдзельную вагу ў агульных укладах крэдытнае каапэрацыі.

Таксама шкадліва адбіваецца на працы не на зусім адпаведна пастаўленая работа Рэвізыйных Камісій і асабліва Саветаў, якія на свае абавязкі глядзяць залішне павярхоўна і незаўсёды ўважліва: ёсьць такія Саветы, якія за цэлы год ня здолелі правесьці ніводнага пасяджэньня. А дзякуючы гэтай нядбайнасьці вынікаюць і другія недахопы: скарыстоўваньне сродкаў не па свайму простаму прызначэньню, выдача кароткатэрміновых пазык замест доўгатэрміновых і г. д.

Абмеркаваўшы ўсё гэта, зьезд намеціў цэлы шэраг мерапрыёмстваў, якія павінны зьнішчыць недахопы і паставіць працу крэдытных таварыстваў на належную вышыню. Мы застановімся толькі на некаторых:

1) поўнасьцю і належна скарыстоўваць бядняцкія фонды, што павялічыць проц. каапэраваньня беднякоў;

2) увесьці каапэрацыйную даплату пайшчыкам у залежнасьці ад прыбытковасьці аперацый па збыту;

3) прыцягваць да адказнасьці вінаватых у тым, хто выдае пазычкі не па прызначэньні і без захоўваньня тэрмінаў і працэнтаў;

4) абавязаць Рэвізыйныя Камісіі ня менш двух разоў у год праводзіць рэвізію, а саветы—лепш наглядаць за агульнаю працаю таварыстваў.

Зьезд выбраў Праўленьне Саюзу ў складзе т. т. Пыжыкава, Клішэўскага і Хадасевіча, а таксама Рэўкамісію і Савет Саюзу.

КУЧЫНСКІ.

ПА ПОЛАЧЧЫНЕ*).

Полацкія цені.

У Полацку, як і ва ўсякім горадзе, галоўная ўвага аддаецца цэнтру. Яго чысьцяць, глядзяць, асьвятляюць, прыхарашваюць. Цэнтр заняты ўстановамі і гандлем: служылы люд, саматужнікі і гандляры—асноўная маса цэнтру. Тут жывуць дзейна, дыхаюць больш лёгкім паветрам...

А вось полацкія акраіны,—яны, мне здаецца, бяз усякай апекі. Гразь на полацкіх акраінных вуліцах штосьці неўявімае. На вуліцах там у дажджлівую пару ня езьдзяць, а плаваюць. А па Бязыменнаму завулку аж да самай Ленінскай вуліцы (цэнтр) нават і плаваць нельга: коні з каламашкамі тонуць.

Насяляюць гэтыя акраіны часткай рабочыя, дробныя майстры, а галоўная маса—люд бяз пэўнага сацыяльнага твару. Гэта тыя людзі, якія ў нашы часы ня робяць жыцьця, якія нават ня ідуць за ім—яны проста жывуць. А чым яны жывуць, як жывуць, яны і самі вам не адкажуць на гэтае пытаньне:

— Ат, жывём і ўсё.

Трэба было-б бліжэй прыглядзецца да гэтага жыцьця, каб накіраваць яго па больш жывому, больш здароваму шляху.

Вечар дзеліць полацкіх грамадзян на дзьве няроўныя часткі: адна—дзейная, актыўная частка запаўняе ўвечары клюбы, бібліятэку—карыстае час разумна. Клюбаў у Полацку даволі, бадай, кожны саюз мае свой клюб, і абсталяваны яны здавальняюча.

Другая частка полацкіх грамадзян, акраінная, у значнай меры моладзь, рэгулярна штодня, ад 7 да 12 гадзіны дзейна «шліфуе» тратуары па вул. К. Маркса: ад Гогалеўскай да плошчы і назад.

Адно невялічкае кіно, з адной праграмай на тыдзень, ды час ад часу гастралёры, большасьцю халтура,—ня могуць цалкам задаволіць спэцыфічныя «культурныя» запатрабаваньні гэтай часткі грамады. Некаторыя з іх шукаюць другіх забаў, забаў ілюзыйнага характару.

А для гэтых забаў поле дзейнасьці ў Полацку шырокае. Цэрабкопаўскія сталоўкі з півам, тры інвалідных піўных з продажам гарэлкі ў неабмежаваны час, адна прыватная піўная з тайным продажам гарэлкі,—усе гэтыя ўстановы разьмешчаны ў цэнтры, на гэтым шчодра шліфуемым вучастку. Адна з піўных, пад дзіўнай назвай „Червонных инвалидов", напамінае шынок старых часоў: алкагольны чад, п'яная дзікая лаянка, бруд, гразь.

Наогул, полацкія ўстановы грамадзкага харчаваньня і падсобныя ім ня могуць пахваліцца чыстатой. Я, напрыклад, бачыў хлебапякарню, што пад ведамам камітэту ўзаемадапамогі (на Ленінскай вуліцы). Маленькае цеснае сутарэньне, дзьве печы ў якім займаюць большую палову памяшканьня; падлога ўкрыта пластам гразі на вяршок таўшчынёй. Ад печы да сьцяны—2 аршыны. Калі пекар садзіць хлеб у печ, дык лапатай ён упіраецца ў процілеглую сьцяну. Я глядзеў, як пекар мачаў памяло ў ваду, каб вымесьці под. Гэта была не вада, не, гэта і не памыі былі,—гэта быў самы натуральны бруд!

Гарачыня ў памяшканьні немажлівая. Падручны пекара працуе без партак, сьпераду прыкрыты фартухом, які мыўся к першамайскім урачыстасьцям. У гэтым-жа брудным памяшканьні, атакаваныя хмарай мух, стаяць дзьве скрыні з рашчынай. Тут-жа і хлеб фармуецца, тут-жа ён і складаецца.

А пякарня працуе круглыя суткі, на пяць зьмен: выпякае 100 пуд. хлеба, які корміць блізка пятую частку насельніцтва гораду! Гэта, па-мойму, павінна было-б хоць крыху зацікавіць санітарны нагляд.

Дый наогул ня шкодзіла-б бліжэй прыглядзецца да грамадзкага харчаваньня ў Полацку.

Ці патрэбна такая колькасьць закусачных і піўных у горадзе? Рамантуемая зараз 1-я сталоўка ЦРК, 2-я сталоўка ЦРК, адна інвалідная сталоўка з посьпехам могуць забясьпечыць горад. А рэшту «закусачных» можна было-б прычыніць. Рабочыя першыя падаюць у гэтым прыклад. Яны патрабуюць ад гарсавету зачыненьня піўной Баркана, які прымасьціўся каля новай пабудовы камгасу і спойвае і ашуквае рабочых і крэдытам і палічэньнямі.

У 10 гадзін піўныя пачынаюць выкідаць п'яныя целы на вуліцу, дзе іх услужліва прымаюць часам міліцыянэры, а большай часткай полацкія „баядэркі".

Тут-жа ў цэнтры піўных разьмясьцілася другое дзіўнае месца забаў—цір. У гэтым „ціры" практыкуецца нейкая „швейцарская стральба". Уявіце сабе стол, на ім малюнкі зьвераў і птушак, падзеленыя лініямі на квадраты. На адным канцы стала ўпоперак прыладжан круг так, каб ён мог рухацца, на другім—нейкі самастрэл.

Стол цесна абступіла грамада ігракоў. Калі грошы з ігракоў сабраны, адзін дзядзя разганяе круг, а другі запушчае ў гэты час з самастрэлу нейкую іголачку. Яна абавязкова пападае ў круг, на якім такія-ж малюнкі, як і на стале. Хто ставіў на салаўя, выйграе ў два разы больш, хто на льва—у тры разы, а наогул, урэшце, усе прайграюць.

Тут-жа поплеч—другая „забава". Да сьцяны прыладжана кардонавая фігура цыркавога клёўна з адчыненым ротам. І вось прыходзіць які-небудзь чудак, бярэ за грыўню тры мячыкі і давай іх шпураць у адчынены рот клёўна. Папаў дурань мячыкам у дзірку—рагоча, здаволен, не папаў—другія рагочуць. Вось і ўся забава.

Што дае такі „цір", каму патрэбна такая забава? Што яна разьвівае?

Праўда, „цір" — „прадпрыёмства" дзіцячай камісіі, прыбытак ідзе на бяспрытульных. Але я ня думаю, каб тут быў прыбытак, а калі-б ён і быў, дык у карысьць бяспрытульных можна сабраць грошы іншым шляхам, больш культурным. Навошта карыстаць азарт несьвядомай масы (швейцарская стральба—тая-ж лётарэя), або разьвіваць у ёй дзікія інстынкты, бо кідаць мячыкі ў рот клёўна спортам назваць нельга.

Асеньняе ажыўленьне.

Полацак перажывае гарачыя дні. Значнае ажыўленьне наглядаецца ў судовых установах. У выязной сэсіі вярхоўнага суду разглядаецца справа Лапкоўскага, Багданава і іншых; на чарзе—справа судзьдзі Шалімава; далей будзе справа полацкіх камбінатаў. Гэтыя ўсе працэсы выклікаюць шырокую зацікаўленасьць грамадзкай думкі.

Асаблівае ажыўленьне прыкмячаецца ў інспэктарыяце народнай асьветы. Тут зранку і да канца заняткаў—натоўп народу. Прыходзяць дзеці, старыя, прыяжджае моладзь з вёскі.

Вёска ў апошнія часы прад'явіла вялікі попыт на асьвету. У Пэдтэхнікум і Лясны Тэхнікум сёлата нябывалы наплыў заяў. Прыймовыя камісіі, праводзячы ўважлівы сацыяльны адбор, прымаюць тых, бацькі якіх плацяць 3-5 рублёў падатку. Гэта, канешне, ня можа здаволіць жаданьня вучыцца нават бядняцкай часткі вёскі. Значная частка вясковай моладзі, скончыўшай раённыя сямігодкі, застаецца толькі пры сваім жаданьні вучыцца далей,—выканаць гэта жаданьне яна ня можа.

Ёсьць нездаволеньні і ў горадзе. Гарадзкія сямігодкі перапоўнены да адказу, асабліва другія канцэнтры. Яны ня могуць зьмясьціць усіх скончыўшых першы канцэнтр і чатырохгодкі і частка дзяцей, скончыўшых чатырохгодкі і першы канцэнтр, застаецца па-за сьценамі школы. Гэта дзеці дробных гандляроў і іншых такіх нявыразных «прафэсіяў», уладаючыя якімі ня жывуць, а, як кажуць, «верцяцца». Кантынгэнт гэты ў Полацку даволі значны і ён вельмі нездаволен абмежаваньнем для яго магчымасьці вучыцца.

Інспэктарыят асьветы ваюе зараз за павялічэньне бюджэту, які і так займае ў агульным бюджэце акругі 38 проц.

Інспэктарыят Асьветы праводзе таксама асеньнюю самакрытыку ў сваіх радох: укамплектоўвае, пераўкамплектоўвае, адсявае некарысны элемэнт.

На гэтым грунце вынікаюць, зразумела, непаразуменьні. Вось адно даволі арыгінальнае з гэтых непаразуменьняў. Настаўніца 9-й школы гр. Н. Маладзежка за мінулы навучальны год прапусьціла бяз уважлівай прычыны 17 вучэбных дзён і 7 пасяджэньняў школьнай рады, з агульнага ліку—14.

Наша савецкая школа прагулаў ня любіць, Маладзежку, натуральна, звольнілі з працы. РКК, куды гр. Маладзежка падала скаргу, знайшла кірунак адміністрацыі правільным. Інакш паглядзела на справу гр. Маладзежка, маючы на гэта нейкія свае віды. На пастанову РКК, і Інспэктарыяту Асьветы яна падала скаргу ў Акруговы Інспэктарыят Працы. І вось Бюро нагляду па працоўных справах пры Інспэктарыяце Працы ў пасяджэньні за 7 верасьня выносіць арыгінальную пастанову:

«Пастанову РКК скасаваць, як парушаючую арт. 133 Кодэксу Закону аб Працы ў сэнсе пераводу ў віду цяжарнасьці Маладзежка і прычыны неакуратнага наведаньня заняткаў, зьяўляюцца важнымі, што сьведчаць далучаныя да заявы дакуманты».

Далучаныя дакуманты ні аб чым ня сьведчаць, бо прагулы былі ўзімку. Апрача таго, арт. 133 Кодэксу Законаў аб Працы забараняе далёкія камандыраваньні і перавод цяжарных жанчын бяз іх згоды на гэта.

Калі Інспэктарыят Асьветы зазначыў гэтую акалічнасьць, што Маладзежка проста звальняецца за нежаданьне працаваць, а не камандыруецца, дык адзін з сяброў Бюро нагляду адказаў:

— Ну што-ж, прыдзецца падшукаць другі артыкул.

Чаму-ж Інспэктарыят Працы так абараняе гр. Маладзежка, якая сваімі яўнымі прагуламі парушае нармальную школьную працу? Кажуць, за тым, што настаўніца Маладзежка крыху зрадні інспэктару працы т. Антонаву—жонкай яму прыходзіцца. Канешне, такую малжонскую чуласьць мы павінны толькі вітаць, але ўсё-ж ткі гэта чуласьць не павінна перашкаджаць нармальнай працы нашай школы.

У Акруговым Інспэктарыяце Асьветы (тут-жа і Акрнацкамісія) можна наглядаць абразкі другога парадку.

Вось, напрыклад, прыходзе ў інспэктарыят настаўнік Баравухінскай школы Савіцкі і просіць праэкзаменаваць яго па беларускай мове. Старэнькі, сівенькі, аж дзіву даешся, што да гэтай пары ён мовы ня вывучыў.

Але дзіўнага тут нічога няма: гэты скромны настаўнік Баравухінскай школы Савіцкі—былы інспэктар народных вучылішч. Гэта адзін «из стаи славных» можа і не актыўных, але ўпартых полацкіх (у мінулым, канешне), ворагаў беларусізацыі. Цяпер ён ужо сам прыходзе ў нацкамісію і просіць «праэкзаменаваць» яго па беларускай мове. Пералом у адносінах да беларусізацыі адбыўся ў ім зусім натуральна.

І гэты пералом прыкмецен усюды. Разьясьніцельная праца ў галіне нацыянальнага пытаньня дала магчымасьць зразумець кожнаму сутнасьць нацыянальнай палітыкі савецкай улады і камуністычнай партыі. Палачане цяпер ужо ўразумелі, што савецкая ўлада і камуністычная партыя не жартуюць з беларусізацыяй, што пытаньне беларусізацыі пастаўлена рашуча і цьвёрда.

Праўда, у галіне беларусізацыі ў Полаччыне ня ўсё яшчэ гладка, у акруговым саюзе спажывецкіх таварыстваў, напрыклад, не пачуеш яшчэ ніводнага слова пабеларуску; пракурор акругі яшчэ ня ведае, што за месяц такі—студзень. Вобальскае лясьніцтва, напрыклад, утварыла свой правапіс і шпарыць па ім паперкі так, што і самі ня ведаюць пра што пішуць.

Сустракаюцца яшчэ і варожыя адносіны да беларусізацыі. Часта можна пачуць як лаюць «эту мову», калі які-небудзь „душка военны", гарцуючы сваім красамоўствам перад сваёй „дамай сэрца", высьмейвае беларускую мову, а заадно і ўкраінскую. „Дама сэрца", якая-небудзь полацкая пішмашыністка, хіхікае, але, прышоўшы да хаты з пагулянкі, хутчэй бярэцца «за Лёсіка» і зудзіць яго да поўначы, бо „Нацкамисия требует знания белорусского языка".

А Нацкамісія запраўды трэбуе. Гэтымі днямі з полацкай пошты, згодна патрабаваньня Нацкамісіі, звольнены два працаўнікі, якія ўпарта адмаўляліся вывучаць беларускую мову.

Такія патрабаваньні Нацкамісіі, яшчэ больш суровыя, канчаткова зьліквідуюць настрой пасыўнага пярэчаньня беларусізацыі, і палачане запамятуюць канчаткова аб тых часох, калі яны так неразумна паўставалі супроць таго, чаго фактычна нельга ўжо было ні спыніць, ні стрымаць.

(Далей будзе).

Л. Свэн.

*) Гл. «Сав. Бел.» № 223.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ

ПА ДАКЛАДУ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ І САДАКЛАДУ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ СЯЛЯНСКІХ ТАВАРЫСТВАЎ УЗАЕМАДАПАМОГІ АБ СТАНОВІШЧЫ САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ Ў БССР.

Правадзімая ў Рэспубліцы савецкая сыстэма сацыяльнага забясьпечаньня зьяўляецца адным з важнейшых дасягненьняў Кастрычнікавай Рэвалюцыі. Гэта сыстэма сацыяльнага забясьпечаньня мае на мэце, ў процівалегласьць старому буржуазнаму парадку, аказаньне поўнай дзяржаўнай дапамогі працоўным, што не эксплёатуюць чужое працы і страцілі працаздольнасьць, з вядзеньнем, аднačасова з гэтым, барацьбы з усякага роду паразытызмам і дармаедзтвам і ставячы сваёй мэтай зьвярнуць у сям'ю працоўных кожнага, хто быў выкінуты з працоўнае каляі жыцьця.

На шляху ажыцьцяўленьня гэтае сыстэмы ў галіне сацыяльнага забясьпечаньня за ўвесь час работы маюцца значныя дасягненьні, якія выяўляюцца: у ўзмацненьні эканамічнай базы для пашырэньня пастаўленых савецкай уладай задач у галіне сацыяльнага забясьпечаньня, у павялічэньні кантынгентаў забясьпечваемых і норм забясьпечаньня, а таксама ў гэты час у сыстэме сацыяльнага забясьпечаньня ўтвораны цэлы шэраг працоўных, грамадзкіх арганізацый і прадпрыемстваў, якія дапамагаюць інвалідам зьвярнуцца да працоўнага жыцьця і палепшыць іх дабрабыт.

Сацыяльнае забясьпечаньне, як адзін з неабходных фактараў пабудовы сацыяльнага быту працоўных, павінна заняць адно з важнейшых месц у пабудове сацыялістычнае грамады.

Разьвіцьцё сацыяльнага забясьпечаньня залежыць, галоўным чынам, ад агульнага эканамічнага становішча краіны: толькі па меры ўзросту народнай гаспадаркі Рэспублікі зьяўляецца магчымым справу сацыяльнага забясьпечаньня пашырыць адпаведна з павялічэньнем матар'яльных і культурных запатрабаваньняў насельніцтва.

Маніфэст Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР за 15-е Кастрычніка 1927 году аб павялічэньні асыгнаваньняў на забясьпечаньне ваенных інвалідаў, ня менш чым у двойчы, даў магчымасьць большага ахопу пэнсіяніраваньня.

Але побач з дасягненьнямі, маючыміся ва ўсіх галінах сацыяльнага забясьпечаньня, з узростам і ўзмацненьнем грамадзкіх арганізацый у сыстэме сацыяльнага забясьпечаньня, трэба прызнаць, што дасягнутыя вынікі зьяўляюцца яшчэ нявыстарчальнымі.

У мэтах далейшага разьвіцьця сацыяльнага забясьпечаньня, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускае ССР, ухваляючы дзейнасьць Народнага Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня, пастанаўляе:

Прызнаць, што далейшае разьвіцьцё сацыяльнага забясьпечаньня павінна прадугледжваць:

1. Поўны ахоп на бліжэйшыя пяць год беспасрэдным дзяржаўным забясьпечаньнем маючых патрэбу ім: інвалідаў грамадзянскай і імпэрыялістычнай вайны, былых чырвоных партызан і іх сем'яў, ахвяр контр-рэвал. і сем'яў забітых на франтох.

2. Далейшае падвышэньне норм пэнсыйнага забясьпечаньня павінна адпавядаць росту сярэдняй заработнай платы рабочых і служачых, а таксама прадугледжваць увядзеньне сямейных надбавак.

3. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня, не дапушчаючы зьніжэньня дасягнутых вынікаў у галіне перанавучэньня і навучэньня інвалідаў вайны, ужыць адпаведныя захады да дастатковага разгортваньня мерапрыемстваў па перанавучэньню і навучэньню сем'яў забітых на франтох і інвалідаў вайны з найменшай стратай працаздольнасьці (IУ-УІ групы) з аднačасовым прыстасаваньнем іх на працу ў сыстэме каапэрацыі інвалідаў, а таксама пашырыць пратэзаваньне інвалідаў, галоўным чынам, рабочымі пратэзамі.

4. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя зьвярнуць большую ўвагу на дачу спэцыяльных відаў лячэньня, а таксама і на забясьпечаньне ложкавай дапамогай у лекавых установах для нэрвовых і псыхічна хворых інвалідаў вайны.

5. Канстатуючы невыстарчальную работу Народнага Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня, Народнага Камісарыяту Асьветы і Акруговых Выканаўчых Камітэтаў у справе культурна-асьветнага абслугоўваньня інвалідаў, прапанаваць у далейшым зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэту працу.

6. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня, Народнаму Камісарыяту Асьветы і Акруговым Выканаўчым Камітэтам аказваць матар'яльную дапамогу па перанавучэньню і навучаньню сьляпых і глуханямых і надаць больш увагі на культ-асьветную працу гэтых катэгорый.

7. Даручыць Савету Народных Камісараў пасьпяшыць з распрацоўкай законаў аб забясьпечаньні за кошт дзяржавы прастарэлых асоб з ліку бядняцкіх пластоў сялянства з такім разьлікам, каб гэты закон быў унесены на зацьверджаньне бліжэйшага Зьезду Саветаў.

8 Даручыць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня і Цэнтральнаму Камітэту Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі ўсебакова распрацаваць пытаньне аб узаемным страхаваньні сялянак з прычыны цяжарнасьці і праэкт закону па гэтым пытаньні падаць у Савет Народных Камісараў, перад падачай яго на зацьверджаньне Савету Народных Камісараў перадаць на абгаварэньне шырокіх колаў сялянства.

9. Улічваючы буйнае значэньне каапэрацыі інвалідаў, якая дае магчымасьць інвалідам на пачатках шырокай самадзейнасьці палепшыць сваё матар'яльнае становішча і прымаць удзел у гаспадарчым будаўніцтве краіны, даручыць Савету Народных Камісараў БССР забясьпечыць далейшае разьвіцьцё каапэрацыі інвалідаў, шляхам уключэньня яе ў пляны цэнтралізаванага здавальненьня, дапушчэньне да ўдзелу ў зарыхтоўках і апрацоўцы некаторых відаў сырцу, фінансаваньня, крэдытаваньня і прадстаўленьне адпаведных пераваг і льгот. Запрапанаваць Акруговым Выканаўчым Камітэтам аказваць неабходнае падтрыманьне і матар'яльную дапамогу ў справе далейшага ўзмацненьня і разьвіцьця каапэрацыі інвалідаў.

10. Даручыць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня і Акруговым Выканаўчым Камітэтам палепшыць становішча дамоў інвалідаў і прытулкаў прастарэлых.

11. Заслухаўшы садаклад Цэнтральнага Камітэту Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР адзначае: што ў працы сялянскай грамадзкай узаемадапамогі ёсьць пэўныя дасягненьні ў галіне ахопу бядняцка-серадняцкіх пластоў сялянства, а таксама і ў галіне каапэраваньня бядняцкіх гаспадарак, арганізацыі сельска-гаспадарчых калектываў, розных вытворчых арцеляў, прадпрыемстваў, пракатных і злучных пунктаў, павялічэньня насеннага і грашовага фонду і аказаньня дапамогі беднаце.

Разам з гэтым Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР адзначае ў дзейнасьці сялянскай грамадзкай узаемадапамогі наступныя недахопы: недастатковае праяўленьне ініцыятывы і самадзейнасьці таварыстваў у справе калектывізацыі сялянскіх бядняцкіх гаспадарак; слабая сувязь таварыстваў з каапэрацыйнымі арганізацыямі, у зьвязку з чым заўважаецца нескарыстаньне сродкаў па каапэраваньню беднаты; вельмі слабае разгортваньне таварыствамі грамадзкай працы і справаздачнасьці перад выбаршчыкамі; у большасьці таварыстваў адсутнічаюць пляны працы і нездавальняюча пастаўлена рахункаводзтва і справаводзтва; рэдкае і няплянавае інструктаваньне сельскіх таварыстваў з боку раённых старшынь і акруговых упаўнаважаных; недастатковая арганізацыя і аказаньне таварыствамі працоўна-грамадзкай дапамогі незаможным сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам і беднаце; нездавальняюча пастаўлена праца рэвізійных камісій т-ваў; нездавальняючая падрыхтоўка беднаты і батракоў да перавыбараў таварыстваў, у выніку чаго некаторыя таварыствы мала працаздольны; слабае кіраўніцтва таварыствамі з боку сельсаветаў і райвыканкомаў, ня зьвернута досыць увагі з боку сельсаветаў і райвыканкомаў, ня зьвернута досыць увагі з боку райвыканкомаў і сельсаветаў на перадачу таварыствам, як у уласнае, гэтак і арэнднае карыстаньне больш прыбытковых прадпрыемстваў і іншай маемасьці; недастаткова аказваецца бядняцкім дзецям школьнага ўзросту дапамога па пасылцы ў школы і забясьпечаньне іх падручнікамі, прыладамі і адзеньнем; вельмі слабае спагнаньне таварыствамі сяброўскіх узносаў, натуральных і грашовых пазычак, што перашкаджае ўзмацненьню іх матар'яльнае базы; скарыстоўваньне раённых працаўнікоў на іншай працы, чым паслабляецца праца ў галіне сялянскай, грамадзкай узаемадапамогі.

Надаючы надзвычайнае значэньне сялянскай грамадзкай узаемадапамозе, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР лічыць патрэбным, што далейшая работа ў гэтым напрамку павінна ўзмацняцца пры аднačасовым зварочваньні асаблівай увагі на наступныя мерапрыемствы: па калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі, арганізацыі таварыстваў: па супольнай апрацоўцы зямлі, машынных, малочных, агнетрывалых арцеляў і іншае, а таксама і на каапэраваньне беднаты па ўсіх відах каапэрацыі асабліва па лініі сельска-гаспадарчай, па ўзмацненьню работы ў галіне аказаньня дапамогі і ўзаемадапамогі сельскай беднаце, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам вайны, былым чырвоным партызанам і іх сем'ям, адзінокім жанчынам-бядначкам, асабліва зьвярнуўшы ўвагу на аказаньне працоўнай дапамогі і на поўнае ажыцьцяўленьне дадзеных льгот беднаце; на прыняцьце актыўнага ўдзелу ў кампаніях па перавыбарах саветаў і каапэрацыйных арганізацый, з вылучэньнем на кіруючую працу ў іх актыўных беднякоў і серадьнякоў, якія праявілі сябе на рабоце па сялянскай грамадзкай узаемадапамогі. Аднačасова з далейшым разгортваньнем культурна-асьветнае працы ўцягваць ва ўсе праводзімыя кампаніі партыяй і савецкай уладай сяброў таварыстваў.

Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам забясьпечыць кіраўніцтва і неабходную дапамогу камітэтам сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі з боку раённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў.

12. Даручыць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня ўзмацніць мерапрыемствы па барацьбе з жабрацтвам, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на кіраўніцтва гарадзкой і местачковай узаемадапамогай.

Запрапанаваць Акруговым Выканаўчым Камітэтам прадугледзіць на мерапрыемствы па барацьбе з жабрацтвам па бюджэце сродкі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

23 верасьня, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БЕЛОРУССКОЙ СОЦИАЛИСТИЧ. СОВЕТСКОЙ РЕСПУБЛИКИ.

ПО ДОКЛАДУ НАРОДНОГО КОМИССАРИАТА СОЦИАЛЬНОГО ОБЕСПЕЧЕНИЯ И СОДОКЛАДУ ЦЕНТРАЛЬНОГО КОМИТЕТА КРЕСТЬЯНСКИХ ОБЩЕСТВ ВЗАИМОПОМОЩИ О СОСТОЯНИИ СОЦИАЛЬНОГО ОБЕСПЕЧЕНИЯ В БЕЛОРУССКОЙ ССР.

Проводимая в Республике советская система социального обеспечения является одним из важнейших достижений Октябрьской Революции. Эта система социального обеспечения имеет целью в противоположность старому буржуазному порядку, оказание полной государственной помощи трудящимся, не эксплоатирующим чужого труда и утратившим трудоспособность, с ведением одновременно с этим борьбы со всякого рода паразитизмом и дармоедством и ставя своей целью возвращение в семью трудящихся каждого, кто был выбит из колеи трудовой жизни.

При проведении в жизнь этой системы в области социального обеспечения за все время работы достигнуты значительные успехи, сказывающиеся: в укреплении экономической базы для расширения поставленных советской властью задач в области социального обеспечения, в увеличении контингентов обеспечиваемых и норм обеспечения; за это же время в системе социального обеспечения создан целый ряд трудовых, общественных организаций и предприятий, содействующих возвращению инвалидов к трудовой жизни и улучшению их благосостояния.

Социальное обеспечение, как один из необходимых факторов переустройства социального быта трудящихся, должно занять одно из важнейших мест в устройстве социалистического общества.

Развитие социального обеспечения зависит, главным образом, от общего экономического состояния страны: только по мере роста народного хозяйства Республики создается возможность дело социального обеспечения расширить соответственно с увеличением материальных и культурных запросов населения.

Манифест Центрального Исполнительного Комитета Союза ССР от 15-го октября 1927 года об увеличении ассигнований на обеспечение военных инвалидов не меньше чем вдвое дал возможность большего охвата пенсионирования.

Несмотря на достижения, имеющиеся во всех областях социального обеспечения с ростом и укреплением общественных организаций в системе социального обеспечения, нужно признать, что эти результаты являются еще недостаточными.

В целях дальнейшего развития социального обеспечения, Центральный Исполнительный Комитет Белорусской ССР, одобряя деятельность Народного Комиссариата Социального Обеспечения, **постановляет:**

Признать, что дальнейшее развитие социального обеспечения должно предусматривать:

1. Полный охват на ближайшем пять лет непосредственным государственным обеспечением нуждающихся в нем: инвалидов гражданской и империалистической войн, бывших красных партизан и их семей, жертв контр-революции и семей убитых на фронтах.

2. Дальнейшее повышение норм пенсионного обеспечения должно соответствовать росту средней заработной платы рабочих и служащих, а также предусматривать введение надбавок на семью.

3. Предложить Народному Комиссариату Социального Обеспечения, не допуская снижения достигнутых результатов в области переобучения и обучения инвалидов войны, принять соответствующие меры к достаточному развертыванию мероприятий по переобучению и обучению семей убитых на фронтах и инвалидов войны с небольшой утратой трудоспособности (IУ—УI группы) с одновременным приспособлением их на работу в системе кооперации инвалидов, а также расширить протезирование инвалидов, главным образом, рабочими протезами.

4. Предложить Народному Комиссариату Здравоохранения обратить большое внимание на предоставление специальных видов лечения, а также и на обеспечение коечной помощью в лечебных учреждениях для нервных и психически больных инвалидов войны.

5. Констатируя недостаточную работу Народного Комиссариата Социального Обеспечения, Народного Комиссариата Просвещения и Окружных Исполнительных Комитетов в деле культурно-просветительного обслуживания инвалидов, предложить в дальнейшем обратить особенное внимание на эту работу.

6. Предложить Народному Комиссариату Социального Обеспечения, Народному Комиссариату Просвещения и Окружным Исполнительным Комитетам оказывать материальную помощь по переобучению и обучению слепых и глухо-немых и обратить больше внимания на культурно-просветительную работу этих категорий.

7. Поручить Совету Народных Комиссаров ускорить разработку законов об обеспечении за счет государства престарелых лиц из числа бедняцких слоев крестьянства с таким расчетом, чтобы этот закон был внесен на утверждение ближайшего С'езда Советов.

8. Поручить Народному Комиссариату Социального Обеспечения и Центральному Комитету Крестьянских Обществ Взаимопомощи всесторонне разработать вопрос о взаимном страховании крестьянок на случай беременности и проект закона по этому вопросу представить в Совет Народных Комиссаров; до представления его в Совет Народных Комиссаров передать на обсуждение широких кругов крестьянства.

9. Учитывая большое значение кооперации инвалидов, дающей возможность инвалидам на началах широкой самодеятельности улучшить свое материальное положение и принимать участие в хозяйственном строительстве страны, поручить Совету Народных Комиссаров БССР обеспечить дальнейшее развитие кооперации инвалидов, путем включения ее в планы централизованного снабжения, допущения к участию в заготовках и обработке некоторых видов сырья, финансирования, кредитования и предоставления соответствующих преимуществ и льгот. Предложить окружным исполнительным комитетам оказывать необходимую поддержку и материальную помощь в деле дальнейшего укрепления и развития кооперации инвалидов.

10. Поручить Народному Комиссариату Социального Обеспечения и Окружным Исполнительным Комитетам улучшить состояние домов инвалидов и убежищ престарелых.

11. Заслушав содоклад Центрального Комитета Крестьянских Обществ Взаимопомощи, Центральный Исполнительный Комитет БССР отмечает: что в работе крестьянской общественной взаимопомощи имеются определенные достижения в области охвата бедняцко-середняцких слоев крестьянства, а также и в области кооперирования бедняцких хозяйств, организации сельско-хозяйственных коллективов, разных производственных артелей, предприятий, прокатных и случных пунктов, увеличения семенного и денежного фонда и оказания помощи бедноте.

Вместе с этим Центральный Исполнительный Комитет БССР отмечает в деятельности крестьянской общественной взаимопомощи следующие недостатки: недостаточное проявление инициативы и самодеятельности обществ в деле коллективизации крестьянских бедняцких хозяйств; слабая связь обществ с кооперативными организациями, благодаря чему наблюдается неиспользование средств по кооперированию бедноты; очень слабое развертывание обществами общественной работы и отчетности перед избирателями; в большинстве обществ отсутствуют планы работы и неудовлетворительно поставлено счетоводство и делопроизводство; редкое и неплановое инструктирование сельских обществ со стороны районных председателей и окружных уполномоченных; недостаточная организация и оказание обществами общественно-трудовой помощи маломощным семьям красноармейцев, инвалидам и бедноте; неудовлетворительно поставлена работа ревизионных комиссий обществ; неудовлетворительная подготовка бедноты и батраков к перевыборам обществ, в результате чего некоторые общества малоработоспособны; слабое руководство обществами со стороны сельсоветов и райисполкомов, не обращено достаточного внимания со стороны райисполкомов и сельсоветов на передачу обществам, как в собственное, так и арендное пользование более доходных предприятий и другого имущества; бедняцким детям школьного возраста оказывается недостаточная помощь по посылке в школы и обеспечению их пособиями, принадлежностями и одеждой; очень слабое взыскание обществами членских взносов, натуральных и денежных ссуд, что препятствует усилению их материальной базы; использование районных работников на другой работе, чем ослабляется работа в области крестьянской общественной взаимопомощи.

Придавая чрезвычайное значение крестьянской общественной взаимопомощи, Центральный Исполнительный Комитет БССР считает нужным в дальнейшем усилить работу в этом направлении при одновременном обращении особенного внимания на следующие мероприятия: по коллективизации бедняцко-середняцких хозяйств деревни, организации обществ по совместной обработке земли, машинных, молочных, артелей по огнестойкому строительству и друг., а также на кооперирование бедноты по всем видам кооперации, особенно по линии сельско-хозяйственной, по усилению работы в области оказания помощи и взаимопомощи сельской бедноте, семьям красноармейцев, инвалидам войны, бывшим красным партизанам и их семьям, одиноким женщинам-беднячкам, особенно обратив внимание на оказание трудовой помощи и на полное осуществление предоставленных льгот бедноте; на принятие активного участия в кампаниях по перевыборам советов и кооперативных организаций, с выдвижением на руководящую работу в них активных бедняков и середняков, проявивших себя на работе по крестьянской общественной взаимопомощи. Одновременно с дальнейшим развертыванием культурно-просветительной работы вовлекать членов общества во все проводимые партией и советской властью кампании.

Предложить Окружным Исполнительным Комитетам обеспечить руководство и необходимую помощь комитетам крестьянских обществ взаимопомощи со стороны районных исполнительных комитетов и сельских советов.

12. Поручить Народному Комиссариату Социального Обеспечения усилить мероприятия по борьбе с нищенством, обратив особенное внимание на руководство городской и местечковой взаимопомощью.

Предложить Окружным Исполнительным Комитетам предусмотреть по бюджету средства на мероприятия по борьбе с нищенством.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

23 сентября 1928 г.
г. Минск.

ХРОНІКА.

СЯЎБА НА МЯСЦОХ ПРАХОДЗІЦЬ ЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Водлуг вестак Наркамзему, сяўба на мясцох заканчваецца нармальна. Трэба меркаваць, што заданьне па пашырэньню пасяўнога пляцу выканана нават з перавышэньнем.

Падлягаючае па пляну да завозу насеньне і ўгнаеньне выканана поўнасьцю. У паўночных акругах масавая сяўба закончылася, у сярэдніх і паўднёвых заканчваецца.

Што-ж датычыцца зернаачышчэньня, то трэба адзначыць, што насеньне пшаніцы, як масавае зьявішча, ачышчалася і пратручвалася ад сажы. Больш дрэнна абстаяла справа з ачысткай жыта, бо гэтаму перашкаджала позьняя малацьба.

Наогул, трэба адзначыць, што асеньняя пасяўная кампанія прайшла здавальняюча, і недасеваў сёлета ня будзе.

Аб парадку пераходу на агнятрывалае будаўніцтва.

Дзяржплян БССР распрацаваў праэкт пераходу на агнятрывалае будаўніцтва ў сельскіх мясцовасьцях. На гэтаму праэкту, для ўстаноў, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэтах і гаспадарчым разрахунку прадугледжваецца забараніць у населеных пунктах пабудову неагнятрывалых дахаў на ўсіх жылых і службовых будынках. Для будаўніцтва, якое праводзіцца пры дапамозе банкаўскага доўгатэрміновага крэдыту прадугледжваецца забараніць з 1930 году пабудаву неагнятрывалых дахаў на жылых будынках. ВСНГ і акрвыканкомам патрэбна прыняць меры да пашырэньня цаглянага і чарапічнага вырабу для забясьпечаньня сельскага будаўніцтва. Наркамасьветы і Наркамзем БССР павінны будуць падрыхтаваць неабходны кадр спэцыялістаў для сельскага агнятрывалага будаўніцтва.

Гэты праэкт Дзяржпляну ўносіцца на зацьверджаньне ў Савнаркам БССР.

Штраф за парушэньне заканадаўства аб працы.

Наркампрацы БССР распрацаваў інструкцыю па ўжываньню пастановы ЦВК і СНК БССР ад 1-га верасьня аб адміністрацыйных пакараньнях за парушэньні заканадаўства аб працы. Паводле гэтай інструкцыі адміністрацыйныя пакараньні будуць накладацца інспэктарамі Працы ў выглядзе штрафу да 100 руб. за нявыдачу разьліковых кніжак, парушэньне ўстаноўленага парадку па атрыманьню дазволаў на звыштэрміновую працу і г. д.

Пастанова інспэктара працы можа быць абскарджана ў Нар. Кам. Працы БССР, рашэньне якога зьяўляецца канчатковым.

Гэтай інструкцыяй пашыраюцца правы інспэктароў Працы ў галіне змаганьня з парушэньнем заканадаўства аб працы.

Аб арганізацыі дамавых ясьляў.

У сучасны момант у Нар. Кам. Аховы Здароўя распрацоўваецца пытаньне аб арганізацыі дамавых ясьляў на жакт'ах.

Гэтыя дамовыя ясьлі будуць існаваць на зборныя сродкі ад жылкаапэрацыі, спажывецкай каапэрацыі з частковай дапамогай дзяржавы і бацькоў. Да гэтага часу па БССР гэткіх ясьляў ня было. Гэты новы тып ясьляў дасьць магчымасьць прыблізіць іх да работніц і жонак рабочых на месцы іх пражываньня.

Рост ячэек саюзу „Бязбожнік".

У сучасны момант на Менскай акрузе ўжо арганізован 1 раённы савет саюзу «Бязбожнік» у Сьмілавічах, які прыступіў да арганізацыі ячэек на раёне і 11 ячэек на гораду Менску на прадпрыёмствах і ўстановах.

Апрача гэтага арганізаваны 15 ініцыятыўных груп на прадпрыёмствах і ўстановах Менску для арганізацыі ячэек. Па раёнах Менскай акругі праводзіцца падрыхтоўчая праца да арганізацыі райсаветаў і ячэек саюзу „Бязбожнік".

Пашырэньне вэтэрынарнай сеткі.

У 1927-28 г. у БССР існавала 122 вэтэрынарных вучасткі. У 1928-29 г. мяркуецца павялічыць сетку вэтэрынарных вучасткаў яшчэ на 10 і пабудаваць новых 8 лячэбніц.

Апроч гэтага, арганізуюцца бактэрыялёгічныя габінэты: у Дрысе, Полацкай акругі і Камарыне, Гомельскай акр.

Да арганізацыі аэра-санных гурткоў.

Аўтатрактарная сэкцыя аўтадору БССР намячае арганізаваць сёлета ў гарадох БССР аэра-санныя гурткі. У сучасны момант у Маскве высьвятляецца пытаньне аб магчымасьці атрыманьня матораў для аэрасаней. Да гэтага часу гэткія спартыўныя гурткі ў БССР не існавалі.

Кіно-фільм „Аўтамабіль у жыцьцё".

Белдзяржкіно зараз заканчвае кіно-фільм «Аўтамабіль у жыцьцё», заказаны Аўтадорам БССР. У гэтым кіно-фільме будзе паказана праца Аўтадору і ўжываньне аўтамабілю ў штодзённым жыцьці. Таксама будзе засьнята ў кіно-фільме работа па папраўцы і пабудове мастоў, якая была праведзена Аўтадорам у вёсцы Галіца, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну.

Сяляне на курорты.

Сёлета на сродкі дзяржавы адпраўлены на курорты праз акруговыя інспэкцыі аховы здароўя 123 чал. сялян.

Сяляне былі адпраўлены на курорты, Лівадыя, Севастопаль, Эўпаторыя, Сочы-Мацэсто, Сакі, Ліпецк, Старая Руса і г. д.

На курорты сяляне пабывалі па аднаму, паўтары і два месяцы.

У мінулым годзе было адпраўлена на курорты 97 сялян.

У дапамогу сялянцы.

У Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР у сучасны момант абгаварваецца праэкт аб арганізацыі кас узаемадапамогі мацерак-сялянак на дабраахвотных пачатках.

Арганізацыя гэткіх кас узаемадапамогі дасьць магчымасьць аказаць дапамогу сялянкам у справе выхаваньня дзяцей.

Рабочая і батрацкая моладзь—у шэрагі камсамолу.

Падведзены першыя вынікі па ўцягненьню рабочай і батрацкай моладзі ў шэрагі камсамолу з часу сьвяткаваньня МЮД'у. Усяго па Гарадзкому раёну камсамолу ўцягнута звыш 100 чал. рабочай моладзі, Кастрычніцкаму—30 чал., па гор. Барысаву—30 чал., Смалявіцкаму раёну—24 батракоў, Бягомльскаму—12 батракоў, Койданаўскаму—16 батракоў і Заслаўскаму—6 батракоў.

Вячэрнія рабочыя палітэхнікумы.

Скончыўся прыём заяў у Менскі вячэрні рабочы палітэхнікум. Усяго пададзена 129 заяў, з іх дапушчаны да іспытаў 70 чал. і аслабанёна ад іспытаў 11 чал. Усяго будзе прынята ў вячэрнім палітэхнікум 50 чал. Учора пачаліся іспыты. Заняткі пачнуцца ў 1-га кастрычніка.

Такі-ж вячэрні рабочы палітэхнікум будзе існаваць пры Віцебскім палітэхнікуме, куды будзе прынята 40 чал.

Суд.

ДЗЕЙНАСЬЦЬ КІРАЎНІКА СПРАЎ ЦП САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

— Ты гандлюй,—сказаў Ісак Мордухаў Кунцавіцкі свайму бацьку, старому гандляру Мордуху,—а я найду прымажуся на службу ў савецкую ўстанову, буду сябрам саюзу і тады будзе нам лягчэй жыць. Самжа ты бачыш, як цяпер лічацца з сябрамі саюзу: дзеці вучацца дарэмна за кошт дзяржавы, дарэмнае лячэньне, дамы адпачынку і гэтак далей.

Мордух з увагай выслухаў сына і сказаў:

— Ідзі, але глядзі: не забывай свайго бацьку.

Ісак Кунцавіцкі, вёрткі хлапец, як кажуць з язычком, з часам атрымаў пасаду кіраўніка спраў цэнтральнага саюзу працаўнікоў асьветы.

Пасада, як бачыце, адказная, пэнсія здавальняла жыцьцё і патрэбы Кунцавіцкага.

Ажаніўшыся на гр. Левінай, якая служыла статыстыкай у тым-жа ЦП саюзу, Кунцавіцкі адразу супольна з ёй рашылі дапамагаць бацьком, хоць яны прыватныя гандляры і нічога агульнага з саюзам асьветы ня мелі.

Першае, Кунцавіцкі загадаў „статыстыцы", жонцы Левінай, напісаць яму даведку, што браты яго і сёстры зьяўляюцца яго ўтрыманцамі. Па гэтай даведцы трое дзяцей прыватніка гандляра Мордуха былі прыняты ў 31 савецкую школу і вучыліся дарэмна.

Далей, Кунцавіцкі запісаў сям'ю свайго бацькі ў сваю лекавую кніжку, па якой сям'я Мордуха—жонка і дзеці—карысталіся дарэмна мэдыцынскай дапамогай, выклікалі дактароў на дом, а Мордух гандляваў.

Будучы кіраўніком спраў Ісак Кунцавіцкі пралез і заняў пасаду намесьніка старшыні касы ўзаемадапамогі пры цэнтральным саюзе асьветы.

Калі саюз і каса адчынілі дом адпачынку, Кунцавіцкі ў першую чаргу накіраваў у дом адпачынку сваю матку на льготных умовах, хоць муж яе гандляр, мае 2 уласныя дамы на 7 кватэр і гарод у 2 гэктары.

— Куды варты гэткія парадкі,—казалі сябры саюзу асьветы,—нідзе ні відана, каб сем'я прыватнага гандляра карысталася такімі палёгкамі, як бацька Кунцавіцкага.

Але з гэтай гаворкі нічога ня выходзіла. Кунцавіцкі, маючы ў руках уладу кіраўніка спраў, супрацоўніцай жонку і на руках пячатку саюзу, рабіў што хацеў.

Аб гэтым пратэкцыянізьме сынка прыватнага гандляра, як трэба лічыць, ведала і праўленьне цэнтральнага саюзу працаўнікоў асьветы, бо ў часе судовага сьледзтва абаронца Крэйнес імкнуўся прадставіць суду атрыманы абвінавачаным ліст ад былога старшыні праўленьня Ахрамовіча, які ў сваім лісьце абураў завошта абвінавачваюць Кунцавіцкага. На думцы Ахрамовіча, Кунцавіцкі дзейнічаў справідлова, калі абараняў інтарэсы свайго бацькі, прыватнага гандляра, але суд, разглядзеўшы ўсе акалічнасьці справы, прыгаварыў Ісака Мордухава Кунцавіцкага на адзін год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

Дастасаваўшы амністыю ў адзнаку 10 гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі, суд ад трыманьня Кунцавіцкага пад вартай вызваліў.

Д. Кастроў.

Шахматы № 20.

29 верасьня.

Пад рэдакцыяй А. Каспэрскага.

Задача Н. Эйдэльмана—Менск.

Друкуецца першы раз.



Бел. Крh4, Cd2, Кс4, е4.

Чорн. Крd1, Ла2, Кс2, е2, п. g3.

Мат у 2 хады.

Малы чэмпіянат Менску закончыўся; 1 і 2 месца заваявалі Мазэль і Кацнэльсон + 7 з 10, 3 і 4—Кейлес і Насьцюшонак +6½ і 5—Мазэлеў +6, далей Ліўшыц і Штэйн па +5½. Пераможцы маюць права ўдзелу ў камандных спаборніцтвах ад Менску. Парадак дошак гульні ў камандах будзе зацьверджан на пасяджэньні шахсэкцыі.

Трэба адзначыць, што барацьба ў малым чэмпіянаце была вельмі ўпартая, перамогі ня было да астатняга туру. Выдзяліліся ў гэтым турніры Насьцюшонак і Мазэлеў, горш згуляў С. Левін.

Бабруйск. Турнір пераможцаў начскладу Чырвонай арміі закончыўся перамогай Кузьмінскага (Менск) +10 з 11, 2) Муравіка (Клінцы) +9½ і 3) Лапа (Новабеліца) +9.

Усебеларускі шахм.-шаш. зьезд. Зьезд адчыніцца 6 кастрычніка. Будуць праведзены: шахм. чампіянат БССР, удзельнічаць у якім будзе адзін майстар ад Усесаюзнай шахм. сэкцыі, акрамя таго, дагаварыліся з майстрамі Раманоўскім і Модэлям з Ленінграду.

У шашачным чэмпіянаце прымуць удзел тры майстры: І. Гардон (Менск), Міропін (Гомель) і Гінзбург (Масква), вядуцца перамовы з майстрамі С. Гардонам і Рамзам (Ленінград). (Падрабязную праграму глядзі ў наступным аддзеле).

Менск. 25-IX адбыўся сход Менскае групы аматараў шахматных задач і этюдаў. Абрана бюро ў складзе І. Мазэля, Хігеровіча і С. Левіна.

Заўтра, а 12 гадзіне раніцы, у памяшканьні клюбу Савгандслужачых адбудзецца сход шах.-шашачн. актыву на „падрыхтоўцы ўсебеларускага зьезду.

Апавяшчэньні.

— У нядзелю 30-га верасьня з 7 гадзіне ўвечары, у партгабінэце адбудзецца кансультацыя на тэму—ЯК ПАСТАВІЦЬ ДАКЛАД АБ ВЫНІКАХ 6-га КАНГРЭСУ КАМІНТЭРНУ.

Яўка абавязкова для ўсіх дакладчыкаў.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У нядзелю, 30-IX, у 6 гадзін увеч.—пасяджэньне праўленьня дому.

— У нядзелю, 30 верасьня, а 6 гадз. увечары ў Доме Асьветы адбудзецца агульны сход жанчын-тэхпрацаўніц сябровў саюзу Працасьветы разам з жонкамі тэхпрацаўнікоў.

КУТОК ВУЧОНЫХ.

У нядзелю, 30-IX—даклад праф. У. І. Пічэты на тэму: «Гістарычны тыдзень у Бэрліне і гістарычная канфэрэнцыя ў Осло». Пач. а 8 з пал. гадз. увеч.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
Ад аўторка, 25 верасьня,
народны артыст рэспублікі І. М. МАСКВІН
— у мастацкай карціне —
„НАРАДЗІУСЯ ЧАЛАВЕК".

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
Ад аўторка, 25 верасьня, выключная камэдыя
„ГЭТА МОЙ ЖАНІХ" вясёлая камэдыя ў 7 частках.
У галоўнай ролі Оссі Освальд.
3 сэансы: пачатак 1-га а 7 гадз. 30 хв., 2 — а 9 гадз., 3—а 10 гадз. 30 х. Каса адчынена ад 6 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
Ад аўторка, 25 верасьня,
— падвойная грандыёзная праграма —
2 баявікі ў адзін сэанс 2
Нямецкая мастацкая пастаноўка
I. „АБУДЖЭНЬНЕ ЖАНЧЫНЫ" у 7 частках,
з удзелам вядомай акторкі Марыі Якабіні.
II. „ЗЬНІМАК НА ПЛЯЖЫ"
трукавы фільм у 6 частках з удзелам вядомага Рычарда Толмэджа.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 хв.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».
Амэрыканскі фільм
„ТАЙФУН".

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ АСЬВЕТЫ БССР
— АБВЯШЧАЕ —
КОНКУРС на складаньне тыповых праектаў школьных будынкаў для БССР.
УМОВЫ КОНКУРСУ абвешчаны ў «ПРАГРАМЕ КОНКУРСУ», якую можна атрымаць у Народным Камісарыяце Асьветы (Менск, Пляц Волі 2-23, пакой № 15), або ў Акруговых Інспэктарыятах Народнае Асьветы.
Асобы, якія жадаюць прыняць удзел у конкурсе, павінны падаць свае праекты ў Наркамасьветы БССР не пазьней 1 лістапада 1928 г.
1—3.

ЗГУБЛЕНА СТУДЭНЦКАЯ ЗАЛІКОВАЯ КНІЖКА НА ІМЯ Г. ГАЛЬПЕРЫНАЙ.
Знайшоўшага просяць пераслаць яе ў Дэканат Пэдфаку БДУ (Земляробскі завулак, 9).

АСЬВЕТНІКІ! АСЬВЕТНІКІ!
ВЫПІСВАЙЦЕ ЧАСОПІСЬ „АСЬВЕТА".
НОВЫЯ ПАДПІСЧЫКІ, ШТО ПАДПІШУЦЦА НА «АСЬВЕТУ», ПАЧЫНАЮЧЫ З №№ 5—7 ДА КАНЦА 1928 ГОДУ,
АТРЫМАЮЦЬ ЗАДАРМА
№ 8 ЗА 1927 ГОД,
ДЗЕ ЗЬМЕШЧАНЫ ПРАГРАМЫ САМААДУКАЦЫІ.

ЗГУБЛЕНЫ:
— Асабовае пасьведчаньне з візай, выд. Магільлянск. с-сав. на імя Бэрнштэйна Л. Г., кв. 1259.
— Прызыўная кніжка дапрызыўніка Заранкага М. Г., выд. Каралінскім РВК, кв. 1260.
— Асабовая кніжка за № 892 Купрыяновіча В. Г., выд. Жыткавіцкім РВК, кв. 1261.

Ад Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР
2-гі тыраж выйгрышаў па 48 сэрыі Дзяржаўнай Унутранай Выйгрышнай Пазыкі Умацаваньня Сялянскай Гаспадаркі
АДБУДЗЕЦЦА
ў Гомельскай акрузе з 7-га па 14-е кастрычніка 1928 г.
У тыражы будзе разыграна 1386 выйгрышаў на агульную суму 87500 руб. у тым ліку:
1 выйгрыш у 1000 руб. — 300 выйгрышаў па 100 руб.
5 выйгрышаў па 500 » — 1080 выйгрышаў па 50 »

Выйграўшая аблігацыя пагашаецца і ня ўдзельнічае ў наступных тыражох.
Апроч выйгрышу, трымацелю выйграўшай аблігацыі выплачваецца намінальны (указаны на аблігацыі) кошт, а таксама процанты, якія нарасьлі па купону да дню аплаты аблігацыі.
Выплата выйгрышаў, а таксама кошт аблігацый, якія выйшлі ў тыраж, і процантнага прыбытку па гэтых аблігацыях, адбываецца па атрыманьні на мясцох тых чарговых нумароў газэты, якія ідуць за тымі нумарамі, у якіх абвешчана афіцыйная табліца выйгрышаў.
Выйгрышы ў 50 і 100 руб. выплачваюцца ўсімі ўстановамі Дзяржбанку, касамі ашчаднасьці, паштова-тэлеграфнымі ўстановамі і ўстановамі с.-г. крэдыту.
Апроч таго, выплата выйгрышаў у 50 і 100 р. праводзіцца таксама на самым тыражы ў дні розыгрышу.
Выйгрышы ў 500 і 1.000 руб., а таксама часткі гэтых выйгрышаў выплачваюцца Праўленьнем Дзяржбанку ў Маскве.
Калі выйграўшы жыве па-за Масквою, дык атрыманьне выйгрышаў у 500 руб. і ў 1.000 руб. і іх частак ён можа даручыць адной з пералічаных устаноў, якія выплачваюць дробныя выйгрышы. У гэтым выпадку прад'яўніку выйграўшай аблігацыі ў атрыманьні ад яго гэткай выдаецца адпаведны квіт.
Прад'яўнік выйграўшай аблігацыі мае права атрымаць без чаргі любую с.-г. машыну на ільготных умовах.
Тыраж па аблігацыях 11 сэрыі будзе праводзіцца з 28-га верасьня 1928 г. у гор. Новаград-Валынску, Валынскай акругі УССР, а па 39 сэрыі—з 28 верасьня 1928 г. у с. Нялідава, Бельскага павету, Смаленскай губ.

Галоўлітбел 302.
1-я дзяржаўная друкарня